

ЧАГО НЕ ЛЮБІЦЬ ЖОЎЦЕВЫ ПУЗЫР? **8**

КУДЫ ДЗЕЦЬ ЯДЗЕРНЫЯ АДХОДЫ? **11**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЖНІЎНЯ 2019 г. СЕРАДА № 147 (29014)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь САЛАВЕЙ, старшыня Гомельскага аблвыканкама:**

*«Цеснае ўзаемадзеянне бакоў сацыяльнага партнёрства паміж Гомельскім абласным выканаўчым камітэтам, абласным саюзам наймальнікаў і аб'яднаннем прафсаюзаў рэгіёна рэалізуецца ўжо амаль 20 гадоў. Практыка пераканаўча паказвае, што толькі на аснове ўзаемнага канструктыўнага дыялогу, праведзення ўзгодненай палітыкі ў сферы працоўных адносін магчымы дынамічны рост эканомікі і паляпшэнне якасці жыцця насельніцтва. Намаганні бакоў сацыяльнага партнёрства ў апошнія гады былі накіраваны на павышэнне ўзроўню заработнай платы і сацыяльнай абароненасці работнікаў, на скарачэнне беспрацоўя, умацаванне сацыяльна-эканамічнай стабільнасці ў рэгіёне. Напрыклад, летась на 7,5 тысячы вырасла колькасць створаных рабочых месцаў, больш чым на 700 — колькасць новых прадпрыемстваў, на трэць павялічылася колькасць самазанятых».*

# Белыя пачынаюць і выйграюць!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Летні выхадны ў Глыбокім.

## КОРАТКА

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся ўчора з экс-прэзідэнтам Кыргызстана Курманбекам Бакіевым і павіншаваў яго з 70-гадовым юбілеем.

**• У Беларусі на пачатак жніўня адкрыта больш за 71,5 тысячы дэпазітных рахункаў на сямейны капітал на суму звыш $715 млн.**



• Тэмпературныя мінімумы абнавіліся ноччу 6 жніўня ў некаторых населеных пунктах Беларусі (да 3,1 градуса цяпла).




# З джалам навыперадкі

### Як засцерагчыся ад крылатых агрэсараў?

**Жнівень — час, калі пачынаецца пік актыўнасці вос, пчол і шэршняў. Залецець непажаданы госць з джалам можа куды заўгодна — у пакой падчас праветрывання, у салон грамадскага транспарту, ды і проста на кухню, калі вы, напрыклад, робіце варэнне або ясце, скажам, кавун. Але калі ля вашых вокнаў лятаюць дзясяткі вос — значыць, справы дрэнь, і недзе непадалёк знаходзіцца іх гняздо.**

## ТЭСТ НА НЕПАЖАДАНЫХ «СУСЕДЗЯЎ»

— Абстаноўка цяпер складваецца адносна спакойная, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Настасся ШВАЙБОВІЧ.** — У адрозненне ад мінулых гадоў, ліпень і пачатак жніўня ў нас прахалодныя. А джаланосныя насякомыя любяць цяпло, і таму актыўнасць іх нізкая. Але тым не менш яна адзначаецца.

Паведамленні пра знойдзеныя ў жылых дамах і на прысядзібных участках гнёзды небяспечных крылатых суседзяў прадягваюць паступаць. Цяпер у сярэднім за суткі па Мінскай вобласці колькасць такіх зваротаў вагаецца ад 10 да 20. Геаграфія ж — па ўсіх раёнах.

Цікава, што першыя гнёзды вос ратаўнікі здымалі сёлета яшчэ ў... сакавіку. Але за вясну па цэнтральным рэгіёне назбіралася ўсяго 68 такіх просьбаў ад людзей. Затое ў чэрвені, калі большую частку месяца стаяла анамальная спякота, у падраздзяленні Мінскага абласнога ўпраўлення МНС паступіла ўжо 241 тэлефанаванне. Як кажуць, адчуйце розніцу.

СТАР. 4

Класныя навіны

# ЗМЯНІЦЬ ШКОЛУ І... СЯБЕ

### Чаму ў праекта «Настаўнік для Беларусі» добрая будучыня?

**«Кожны дзень мы адкрывалі адно аднаго і самі сябе, змяняліся, развіваліся... Мы навучыліся працаваць у камандзе, набылі велізарную колькасць карысных ведаў... Па адчуваннях, за чатыры тыдні нам далі больш, чым за чатыры-пяць гадоў ва ўніверсітэце. Нашы арганізатары Таццяна Квяцінская, Сяргей Бародзіч, Алена Мельчанка і Зміцер Макарчук — сапраўдныя прафесіяналы! Гледзячы на іх, хочацца расці і заваёўваць вяршыні! У недалёкай будучыні сістэму адукацыі чакаюць каласальныя перамены, і яны пачаліся. Мы сталі часткай новай гісторыі, а якой яна будзе, залежыць толькі ад нас...», — напісала на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы адна з удзельніц праграмы «Настаўнік для Беларусі», псіхолаг Ксенія ГАРШКОВА.**

СТАР. 5



Заняткі падчас летняга інтэнсіву распачыналіся раніцай і заканчваліся толькі бліжэй да ночы.

ISSN 1990 - 763X

19147

# «Візітоўка» Кітая ў Еўропе

## У Мінску да 2023 года з'явяцца новыя спартыўныя аб'екты міжнароднага ўзроўню

**Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку далажылі аб рэалізацыі праектаў тэхніка-эканамічнай дапамогі «Басейн міжнароднага стандарту» і «Нацыянальны футбольны стадыён».**

«Мы даўно планавалі пабудаваць гэтыя аб'екты. Натуральна, гэта вялікія выдаткі, зразумела, што падобныя грошы заўсёды адшукваюцца з намаганнямі, таму што ніводзін прыватнік, думаю, за гэтыя аб'екты не возьмецца, а з дзяржаўнага бюджэту грошы вы ведаеце, куды ідуць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Па дапамогу звярталіся да іншых краін, але там грошай — ці жадання — не знайшлося. На асабістую ініцыятыву Аляксандра Лукашэнкі адгукнуўся кіраўнік Кітая Сі Цзіньпін: праекты будуць пабудаваныя за кошт бязвыплатнай тэхніка-эканамічнай дапамогі КНР. Падчас апошняга візіту Прэзідэнта Беларусі ў Кітай у сёлетнім красавіку Сі Цзіньпін прадэманстраваў макеты басейна і футбольнага стадыёна.

«Будаўніцтва падобных спартыўных аб'ектаў у Мінску ў рамках супрацоўніцтва Беларусі і Кітая — беспрэцэдэнтнае і павінна стаць прыкладам для іншых праектаў, якія плануецца рэалізаваць у будучыні. Для нас вельмі важна стварыць усе неабходныя ўмовы, каб пабудаваць басейн і стадыён у найкарацейшыя тэрміны, на належным узроўні і па міжнародных стандартах», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Менавіта з упорам на гэта ён прасіў падрыхтаваць праекты ўказаў, каб, атрымаўшы грошы, не «валакіціць» партнёраў, не выклікаць нараканняў.

Пры правядзенні субпадрадных работ будуць прыцягвацца беларускія будаўнічыя арганізацыі і максімальна выкарыстоўвацца беларускія будматэрыялы. Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў адказных асоб, што на прадукцыю павінны быць уведзены еўрапейскія стандарты, а айчынныя пакінутыя толькі там, дзе яны не горшыя.

Кітайскі бок гатовы пачаць будаўніцтва ў першай палове наступнага года — і пачне, адзначыў Прэзідэнт, бо гэта залежыць толькі ад беларускіх партнёраў. Ад адказных службовых асоб Прэзідэнт запатрабаваў далажыць, як ідзе падрыхтоўка пляцовак.

Аляксандр Лукашэнка ведае, што ёсць праблемы па грунтах, асабліва ў раёне будаўніцтва плавальнага басейна. Патрабуюць увагі і рабочыя моманты па размяшчэнні нацыянальнага стадыёна. Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз папярэдзіў, каб не ссякалі лішнія дрэвы, а замест ссечаных высаджвалі новыя побач ці ў іншых месцах.

«У мяне пытанне: чаму мы аддаём гэтыя будоўлі Рэспубліканскаму цэнтру алімпійскай падрыхтоўкі па водных відах спорту і Нацыянальнаму алімпійскаму стадыёну «Дынама» (атрымальнікі дапамогі. — **«Зв.»**), ці не хочуць міністры і начальнікі вялікія на чыесьці плечы скінуць адказнасць? І галоўнае, ці справяцца ўстановы з кантрольнымі функцыямі, ці забяспечаць інжынерна-тэхнічнае, юрыдычнае суправаджэнне і эксплуатацыю аб'ектаў?» — выказаў насцярожанасць Прэзідэнт.

Да таго ж, паколькі стадыён і басейн будуць пабудаваныя да 2023 года, Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным ужо сёння планаваць і прапрацоўваць правядзенне міжнародных спаборніцтваў высокага ўзроўню.

«Будаваць будзем. Стадыён і плавальны басейн нам вельмі патрэбныя, таму што гэта не дзяржава, калі яна не мае падобных нацыянальных аб'ектаў. Футбол — народны від спорту, від спорту нумар адзін у нашай краіне, ім займаецца больш за ўсё людзей, пачынаючы ад маленькай вёсачкі да сталіцы. І не мець футбольнага стадыёна, дзе будзе выступаць нацыянальная зборная, гуляць найлепшыя нашы клубы і дзе будуць праводзіцца матчы міжнароднага ўзроўню, — нядобра», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што плаванне, нароўні з лёгкай атлетыкай, — медалеёмісты від спорту, у якім у нас нядрэнная школа.

«Трэба рыхтавацца. Шчыра кажучы, у футбол мы гуляць не ўмеем, плаваць — развучыліся. Але гэта асобная размова», — падвёў вынік Прэзідэнт.

### ПА СУСВЕТНЫХ СТАНДАРТАХ

**Міністр эканомікі Беларусі Дзмітрый КРУТОЙ** паведаміў кіраўніку краіны, што поўнае ўзаемаразуменне бакоў дасягнутае, і праінфармаваў, што агенцтва, якое адказвае за заключэнне міжурадавых пагадненняў, перадала падпісаны мемарандум па прыярытэтах тэхдапамогі для Беларусі.

Міністр расказаў журналістам, што работа з Кітаем па асваенні сродкаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі пачалася ў 2007 годзе. З таго часу ў Беларусі завершана восем праектаў, на якія выдзелена больш за 125 мільёнаў долараў бязвыплатных сродкаў. Сёння ў рабоце сумы на 95 мільёнаў долараў.

На два будучыя спартыўныя аб'екты кітайскім бокам зарэзервавана 235 мільёнаў долараў.

«Кітай лічыць гэтыя аб'екты сваім «тварам» у Еўропе, таму яны вельмі сур'ёзна ставяцца. Гэта будуць сапраўды знакавыя будынкі, як сказаў Прэзідэнт, аналагаў якім не вельмі шмат у нашым рэгіёне», — падкрэсліў Дзмітрый Крутой.

Акрамя стадыёна і басейна, КНР запланавана выдзяленне сродкаў індустрыяльнаму парку «Вялікі камень», мытнаму і пагранічнаму камітэтам, на трэці этап будаўніцтва сацыяльнага жылля і іншыя кірункі — разам каля ста мільёнаў долараў.

Як паведаміў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай СНАПКОЎ,** выхад на будаўнічую пляцоўку плануецца не пазней за ліпень наступнага года. Практычны этап работы пачнецца пасля падпісання Указа Прэзідэнта. Выбар кантрольных устаноў абгрунтаваны: яны адпавядаюць патрабаванням рэгламенту атрымання тэхніка-эканамічнай дапамогі. Аляксандр Лукашэнка даручыў вызначыць службовых асоб, якія будуць несці персанальную адказнасць за ход рэалізацыі праектаў і вытрымліванне адпаведных тэрмінаў.

«Два гэтыя аб'екты — сімвал сяброўскага, пазітыўнага ўваходжання Кітая ў Еўропу на прыкладзе адносін з Беларуссю. Сапраўды, тэхніка-эканамічная дапамога Кітая, праекціроўшчык і генеральны падрадчык — кітайскія арганізацыі, грошы кітайскія, але будавацца аб'екты будуць па міжнародных стандартах, зацверджаных і ўзгодненых міжнароднымі федэрацыямі футбола і плавання», — падкрэсліў Мікалай Снапкоў.

Па яго словах, кітайскі бок прапанаваў эксклюзіўнае будаўнічае і функцыянальнае рашэнне стадыёна і басейна, аналагаў якому ў свеце пакуль няма.

**Варвара МАРОЗАВА.**







Парламенцкі дзённік

# ПАСПЕЦЬ ДА ВЫБАРАЎ

## Работа больш чым па 80 % законапраектаў, унесеных у парламент, павінна завяршыцца падчас асенняй сесіі

**Гэта падкрэсліў старшыня ніжняй палаты парламента Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў. Задача цяперашняга складу парламента — пакінуць мінімум нявырашаных пытанняў калегам, якія будуць абраныя ў заканадаўчы орган восенню. Цяпер у рабоце дэпутатаў знаходзіцца 47 законапраектаў, з іх толькі шэсць будуць разглядаць у першым чытанні.**

«Многія законапраекты дастаткова няпростыя. І пастаянным камісіям трэба над імі вельмі сур'ёзна папрацаваць. Асабліва з такімі законапраектамі, як па пытаннях натарыяльнай дзейнасці, па пытаннях гаспадарчых таварыстваў, па пытаннях выканаўчай вытворчасці. Па законапраекце па абароне правоў карыстальнікаў жыллёва-камунальных паслуг паступілі аб'ёмныя заўвагі», — сказаў спікер Палаты прадстаўнікоў.

Асаблівую ўвагу на сесіі, якая пачнецца 2 кастрычніка, звернуць на работу над «бюджэтным пакетам» на 2020 год. Прыняць яго па традыцыі павінен дзеючы склад ніжняй палаты парламента. Над гэтым законапраектам цяпер актыўна працуе ўрад, створана адпаведная міжведамасная камісія. «Ідзе пошук адпаведных крыніц росту, таму што ў будучым годзе завяршаецца пяцігодка і трэба максімальна ўсе рэсурсы падцягнуць для таго, каб выканаць па максімуме ўсе раней прынятыя рашэнні», — расказаў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў ПІРШТУК.**

З нагоды пачатку выбарчай кампаніі не абмінулі журналісты і пытанняў наконт чаканняў ад яе. Па словах Баляслава Пірштука, у асноўным заканадаўчым органе краіны павінны быць прадстаўнікі ўсіх сфер дзейнасці грамадства: «Важна, каб у парламенце працавалі прафесіяналы, якія ведаюць жыццё не па чутках, якія валодаюць рэальнай сітуацыяй у тых галінах, якія будуць прадстаўляць ці працаваць у камісіях. Няважна персанальна, хто будзе. Гэта не мае значэння. Важна, каб былі людзі, якія перажываюць за краіну, за сваіх выбаршчыкаў і ўмеюць прафесійна адстойваць сваю пазіцыю».

На думку парламентарыя, застанецца і пераемнасць у дэпутацкім корпусе. Яна неабходна для захавання сувязяў у міжнароднай дзейнасці. «Гэта складаныя ўмовы. Такія арганізацыі, як АБСЕ, ПАСЕ — там складана навічкам пачынаць», — заўважыў Баляслаў Пірштук.

Перад дэпутатамі стаіць задача не толькі давесці да лагічнага завяршэння пачатыя законапраекты, але і працягнуць работу па інфармаванні грамадзян аб ужо прынятых навелах.

«Незалежна ад таго, хто з дэпутатаў будзе балатавацца на новы тэрмін, усім неабходна актывізаваць работу ў выбарчых акругах. За мінулую сесію намі былі прыняты шэраг даволі рэзанансных рашэнняў, якія цяпер абмяркоўваюцца ў грамадстве. Гэта, у прыватнасці, законы аб змяненнях у Працоўны, Жыллёвы кодэксы, аб карэкціроўцы антынаркатычных артыкулаў Крымінальнага кодэкса, аб адтэрміноўцы ад вайсковай службы. Шматлікія палажэнні новых законаў патрабуюць дадатковага тлумачэння, абгрунтавання новаўвядзенняў і іх наступстваў для грамадзян», — звярнуўся да калег Уладзімір Андрэйчанка.

Будучыя месяцы багатыя на мерапрыемствы па лініі міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Плануецца ўдзел беларускіх дэпутатаў у 28-й Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора. Асноўная задача дэлегацыі — атрымаць статус назіральніка ў аб'яднанні. У верасні Федэральны сход Швейцарыі прыме ў нашай краіны эстафету па правядзенні канферэнцыі Групы падтрымкі Шаўковага шляху Парламенцкай Асамблеі АБСЕ. У канцы будучага месяца дэпутатаў чакаюць на нарадзе спікераў парламентаў краін Еўразіі ў Нур-Султане.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Місія выканана

## Урад Беларусі разлічвае сёлета восенню падпісаць пагадненне аб спрашчэнні візавага рэжыму з Еўрапейскім саюзам

**Пра гэта на сустрэчы з кіраўніком прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Андрэа Віктарын паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас. Нагодай для размовы стала завяршэнне дыпламатычнай місіі еўрапейскага палітыка ў нашай краіне.**

«Думаю, з нашага боку да восені мы скончым усе ўнутрыдзяржаўныя працэдуры для ўзгаднення дакумента. Вельмі спадзяюся, што восенню пагадненне будзе падпісана. Прынамсі, беларускі бок будзе рабіць усё для таго, каб гэта падзея адбылася», — перадае словы Сяргея Румаса БелТА.

На думку кіраўніка беларускага ўрада, за апошнія чатыры гады адносіны нашай краіны і Еўрапейскага саюза выйшлі на новы ўзровень. Доказ гэтаму — візіты ў Беларусь еўракамісараў, развіццё крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва з еўрапейскімі інстытутамі, плённыя перагаворы па ўступленні Беларусі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

Сяргей Румас выказаў гатоўнасць да далейшага развіцця адносін з Еўрапейскім саюзам і канструктыўнага супрацоўніцтва з новым кіраўніком прадстаўніцтва.

Выбары-2019

# СПАЧАТКУ — КАМІСІІ

## Стартавалі выбарчыя кампаніі ў Нацыянальны сход Беларусі

**Гэта пацвердзіла ўчора на першым арганізацыйным пасяджэнні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў яе старшыня Лідзія ЯРМОШЫНА. Увечары 5 жніўня кіраўніком дзяржавы былі падпісаны адпаведныя ўказы, яны былі ў той жа дзень апублікаваныя на афіцыйным інтэрнэт-партале Прэзідэнта Беларусі і ўступілі ў сілу. Старшыня ЦВК звярнула ўвагу, што размова ідзе пра дзве выбарчыя кампаніі — у Палату прадстаўнікоў, выбары дэпутатаў у якую прызначаныя на 17 лістапада 2019 года, і ў Савет Рэспублікі, куды дэпутаты мясцовых Саветаў абяруць членаў 7 лістапада.**

На пасяджэнні ЦВК быў прыняты шэраг дакументаў, на падставе якіх арганізатары на месцах змогуць распачаць работу па падрыхтоўцы выбараў. Усе гэтыя дакументы ў найбліжэйшы час можна будзе знайсці на сайце Цэнтральнай выбарчай камісіі.

«Першы этап — гэта ўтварэнне акруговых, мінскай гарадской і абласных выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў, — нагадала Лідзія Ярмошына. — Утварэнне іх павінна завяршыцца да верасня ўключна».

Кіраўнік ЦВК паведаміла, што самая буйная па колькасці акруг тэрыторыя — горад Мінск. Тут будзе ўтворана 20 акруговых камісій і адна Мінская гарадская. На другім месцы — Гомельская і Мінская вобласці, дзе па 17 выбарчых акруг і па адной абласной. У Брэсцкай вобласці 16 выбарчых акруг, у Віцебскай — 14. Два самыя невялікія рэгіёны — Гродзенская і Магілёўская вобласці будуць мець па 13 акруговых выбарчых камісій і па адной абласной.

Патэнцыйныя кандыдаты змогуць пачынаць падаваць дакументы толькі пасля ўтварэння выбарчых камісій, якія 3 верасня правядуць свае першыя арганізацыйныя пасяджэнні, дзе кожная камісія вылучыць старшыню, яго намесніка і сакратара. Пасля гэтага прэтэндэнты на ўдзел у выбарчай гонцы могуць падаваць дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў.

Адказваючы перад пасяджэннем на пытанні журналістаў, Лідзія Ярмошына патлумачыла, што часам ахвотных стаць членам выбарчай камісіі больш, чым трэба, таму туды ўключаюць не ўсіх, а выбіраюць найлепшых. «Што датычыцца адмовы ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп, то адна з самых частых падстаў для яе — адсутнасць добраахвотнасці пры фарміраванні такой групы. Група павінна складацца не менш чым з 10 чалавек, гэтыя людзі павінны ўвайсці ў яе склад добраахвотна. Калі падчас апытання выбарчая камісія даведваецца, што нехта з членаў групы не ведаў, што яго прыцягваюць да выбараў, то гэта падстава для адмовы ў рэгістрацыі», — дадала старшыня ЦВК.

На пытанне пра фінансаванне кампаній Лідзія Ярмошына адказала: «Гэта фінансаванне ў адпаведнасці з тымі нормамі, якімі мы звычайна карыстаемся, больш за тое, яно павялічана на адзін мільён рублёў у параўнанні з выбарамі 2016 года, гэта звязана з ростам сярэдняй заработнай платы».

На пасяджэнні ЦВК быў зацверджаны каштарыс на абедзве кампаніі ў памеры каля 23 мільёнаў беларускіх рублёў. Кіраўнік ЦВК паведаміла, што ўжо ўчора МЗС накіравала запрашэнне ў Парламенцкую асамблею АБСЕ, Выканкам СНД і ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва. Пазней Цэнтральная камісія накіруе запрашэнні замежным калегам і ў Сусветную асацыяцыю выбарчых органаў, штаб-кватэра якой знаходзіцца ў Паўднёвай Карэі. Чакаецца, што за выбарамі ў парламент нашай краіны будзе назіраць каля 800 прадстаўнікоў іншых краін і міжнародных арганізацый. Пры гэтым ЦВК не рэгламентуе колькасць удзельнікаў такіх місій.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Жніво-2019

# Сітуацыя выраўноўваецца

## Хлебаробы з паўднёвых раёнаў Міншчыны дапамагаюць калегам на жніве

**У Мінскай вобласці хлебаробы паўднёвых раёнаў прыйшлі на дапамогу сваім калегам з Валожынскага, Смалявіцкага, Чэрвеньскага і Барысаўскага раёнаў. Сюды перакінулі 75 збожжаўборачных камбайнаў і 12 аўтамабіляў, паведамляе прэс-служба Мінаблвыканкама.**

— На ўчарашнюю раніцу ўбрана 67 % усіх плошчаў, намалочана 1187 тысяч тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 34,7 цэнтнера з гектара, — кажа **першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Ігар МАКАР.** — Аднак надвор'е нас не радуе: у найбліжэйшыя дні зноў чакаюцца дажджы. Для выраўноўвання сітуацыі па зборы ўраджаю на палях было вырашана перакінуць тэхніку.

Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Клецкага, Слуцкага, Нясвіжскага і Стаўбцоўскага раёнаў не адмовілі сваім калегам па цэху ў дапамозе. За кожнай тэхнічнай адзінкай замацаваны камбайнер і яго памочнік.

— Усе мы робім адну агульную справу, таму ўзаемадапамога, вядома, неабходная. Стаўбцоўскі раён вылучыў дзевяць камбайнаў і тры аўтамабілі для адвозкі зерня ў Барысаўскім раёне. Там тэхніка будзе працаваць арыенціровачна тыдзень. На раніцу 6 жніўня ў Стаўбцоўскім раёне ўбрана 86 % збожжавых і зернебабовых культур, — канстатаваў **намеснік начальніка ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Стаўбцоўскага райвыканкама Сяргей ГАЎРЫК.**

— У нас працуюць пяці камбайнаў і пяць аўтамашын на адвозцы збожжа са Слуцкага раёна. Экіпажы дапамагаюць убіраць палі адкрытага акцыянернага таварыства «Смалявічы бройлер». Гэта добра, што ў Мінскай вобласці існуе такая практыка. Усё гэта робіцца прадумана і ўзважана, — падкрэсліў **першы намеснік старшыні Смалявіцкага райвыканкама Руслан МІХАЛЕВІЧ.**

Па стане на 6 жніўня, у лідарах па агульным намалоце Нясвіжскі (125 359 тон), Слуцкі (100 527 тон), Капыльскі (97 792 тоны), Мінскі (80 201 тона), Клецкі (77 701 тона) раёны. На Нясвіжчыне ўраджайнасць — 60 цэнтнераў з гектара, у Дзяржынскім, Клецкім, Мінскім, Маладзечанскім раёнах адпаведна — 49, 48, 45, 42 цэнтнеры з гектара.

Усяго ў жніве бярэ ўдзел 2000 збожжаўборачных камбайнаў і столькі ж машын, задзейнічана 560 зернесушыльных комплексаў. Вобласць забяспечыць пастаўкі па дзяржзаказе 185 тысяч тон харчовага збожжа і 15 тысяч тон піваварнага ячменю.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Чалавечы фактар — папярэдняя прычына пажару пад Ачынскам

Чалавечы фактар лічыцца папярэдняй прычынай пажару на складзе боепрыпасаў у Ачынскім раёне Краснаярскага краю, паведаміў намеснік міністра абароны РФ генерал арміі Дзмітрый Булгакаў.

«Прычына папярэдняя — гэта чалавечы фактар. Дакладней скажуць следчыя органы і пракуратура», — сказаў ён. Булгакаў дадаў, што арсенал падлягае расфарміраванню.

«Нейкіх маштабных разбурэнняў, на шчасце, удалося пазбегнуць. Вёска Каменка, найбліжэйшы да арсенала населены пункт, у нармальным стане, — сказаў губернатар Краснаярскага краю Аляксандр Ус. — Па папярэдніх звестках, там ёсць тры сур'ёзна папсаваныя агнём драўляныя будынкі. У дамах выбітыя шыбы, дзверы... Але ўяўленне пра тое, што Каменка сцёртая з аблічча зямлі, абсалютна не адпавядае таму, што там адбываецца», — сказаў Ус.

Нагадаем, што на адным з ваенных складоў Цэнтра матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Цэнтральнай ваеннай акругі 5 жніўня загарэлася сховішча парахавых зарадаў да артылерыйскіх боепрыпасаў, у выніку пажару адбыліся выбухі. Пажар цалкам ліквідавалі 6 жніўня. Паводле крыніцы ў сілавых структурах, пажар адбыўся на дзвюх пляцоўках для ўтылізацыі арсенала. Увогуле на месцы знаходзілася каля 25 тысяч адзінак боепрыпасаў.

Склад Цэнтра МТЗ Цэнтральнай ваеннай акругі ў Ачынскім раёне з'яўляецца адным з найстарэйшых у сістэме матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Узброеных Сіл РФ, паведамілі ў мінабароны. Яго планавалі расфарміраваць да 2022 года.

### Прадстаўнік «Слугі народа» прапануе рэферэндум па пытанні рэінтэграцыі Данбаса

Рашэнне па пытанні рэінтэграцыі непадкантрольных Кіеву тэрыторый Данбаса павінен прымаць прэзідэнт Украіны, аднак спачатку гэтую тэму варта вынесці на ўсеўкраінскі рэферэндум. Такую думку выказаў у інтэрв'ю выданню «Страна» пераможца ў 94-й акрузе (Кіеўская вобласць) на пазачарговых выбарах у Вярхоўную раду ад партыі «Слуга народа» Аляксандр Дубінскі.

«Мы павінны прыняць палітычнае рашэнне, як будзем дзейнічаць. Будзем вяртаць тэрыторыю разам з людзьмі ці будзем кансерваваць канфлікт? Гэтае рашэнне павінен прыняць прэзідэнт. Рашэнне, вынесенае на рэферэндуме, вызначыць шлях — гэта прынясце адказнасці народам, у тым ліку і за выбар прэзідэнта», — заявіў ён.

Дубінскі падкрэсліў, што калі Кіеў лічыць сябе «адзіным з Данбасам», то рэферэндум аб лёсе Данбаса праводзіць неабходна. Пры гэтым ён дадаў, што палітыка рэінтэграцыі не можа мець характар прымусу. Дубінскі таксама выказаўся за адмену гандлёвай блакады Данбаса. «Любы канфлікт можна згладзіць гандлем», — растлумачыў ён.

### Тэлескоп Hubble зняў узаемадзеянне дзвюх галактык

Фотаздымак галактык, якія ўзаемадзейнічаюць між сабой, быў зроблены з дапамогай арбітальнага тэлескопа Hubble. Пра гэта паведамляецца на сайце астранамічнай абсерваторыі.



Гаворка ідзе пра аб'ект UGC 2369. «Галактыкі ўзаемадзейнічаюць — гэта азначае, што за кошт узаемнага гравітацыйнага прыцягнення яны робіцца ўсё бліжэйшымі і бліжэйшыя адна да адной, і іх формы ў працэсе скажаюцца», — адзначаецца ў паведамленні на сайце.

Таксама там гаворыцца, што ўзаемадзеянне галактык адна з адной — распаўсюджаная з'ява. Напрыклад, большасць узаемадзеянняў Млечнага Шляху адбываюцца з карлікавымі галактыкамі.

Спецыялісты прагназуюць, што прыблізна праз 4 мільярды гадоў наш Млечны Шлях сутыкнецца з галактыкай Андрамеды. Як адзначаюць астраномы, верагодна, што галактыкі зліюцца ў адну, якая будзе называцца Мілкамеда.

Ну і ну!

# Парваныя дакументы сышліся, як у пазле

## У Гомельскім раёне махляры спрабавалі схаваць злачынства, парваўшы дакумент на больш чым дзве тысячы фрагментаў

**Эксперт Гомельскага міжраённага аддзела Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Пётр РАДЗЮК сабраў большасць з іх разам, паведаміў карэспандэнту БелТА афіцыйны прадстаўнік упраўлення ГКСЭ рэгіёна Руслан Габрылёў. Гэта аказалася задачай павышанай складанасці.**



«У абсалютнай большасці выпадкаў гэта стандартная аперацыя, якая нагадвае складанне пазла. Аднак гэтым разам у якасці аб'ектаў для даследаванняў выступала больш за дзве тысячы фрагментаў таварна-транспартных накладных і аркушаў паперы, перамяшаных у хаатычным парадку», — расказаў Руслан Габрылёў.

Асноўная складанасць заключалася ў тым, што большая частка кавалачкаў была аднолькавага колеру і мела падобныя рэквізіты. Таксама адсутнічалі многія ключавыя фрагменты, якія не дазвалялі злучыць некаторыя часткі аб'ектаў разам. Эксперту неабходна было ўстанавіць, ці складалі раней гэтыя фрагменты адзінае цэлае. «Для ўстанаўлення цэлага па частках неабходна правільнае разуменне механізма следаўтварэння. Вызначыць прыналежнасць частак адзінага цэлага ўдаецца дзякуючы захаванню на частках падзеленых аб'ектаў узаемазвязваючых прыкмет, якія характарызуюць як аб'ект у цэлым, так і яго асаблівасці», — удакладніў афіцыйны прадстаўнік.

Дзякуючы скрупулёзнай працы і прафесіяналізму эксперта большасць з фрагментаў былі злучаны. Экспертыза дазволіла ўстанавіць асноўныя акалічнасці па справе работнікаў аднаго з прадпрыемстваў рэгіёна. Спрабуючы схаваць факт махлярства і сысці ад адказнасці, яны разарвалі і выкінулі дакументы. Заключэнне эксперта стала ключавым, асноўным і неабвержным доказам па справе.

# СКІНУЦЬ ЦЯЖАР

## Як пазбавіцца ад туберкулёзу, абмяркоўваюць падчас нацыянальнага дыялогу

**Учора і сёння ў Мінску праходзіць Нацыянальны дыялог па туберкулёзе. Прадстаўнікі Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, Еўрапейскай кааліцыі па барацьбе з туберкулёзам, Глабальнага кокуса па туберкулёзе, грамадскай арганізацыі «Сетка людзей, якія перанеслі туберкулёз, — ТВ People», Міністэрства аховы здароўя, РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі, упраўленняў па ахове здароўя аблвыканкамаў, шэрагу грамадскіх і пацыенцкіх арганізацый абмеркавалі супрацоўніцтва ў межах нацыянальнай праграмы барацьбы з туберкулёзам.**

Як адзначыла **намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Наталля ЖУКАВА,** Беларусь уваходзіць у лік 18 краін Еўрапейскага рэгіёна з высокім цяжарам туберкулёзу. Таму ў нас праводзіцца палітыка, накіраваная на стварэнне эканамічных, сацыяльных і прававых умоў, неабходных для прадухілення распаўсюджання гэтай інфекцыі. Лячэнне пацыентаў з усімі формамі туберкулёзу бясплатнае.

— Дзякуючы міжнароднай падтрымцы Беларусь у ліку першых краін у 2015 годзе атрымала новыя і перапрафіляваныя супрацьтуберкулёзныя лекі. Імі пралячылі 1900 пацыентаў з устойлівымі формамі туберкулёзу. Ва ўсіх рэгіёнах сёння шырока выкарыстоўваецца відэакантраляванае лячэнне. Праводзіцца ўкараненне новай мадэлі фінансавання супрацьтуберкулёзнай службы, у межах гэтага аптымізуецца колькасць стацыянарных ложкаў, а вольныя сродкі накіроўваюцца на амбулаторны этап лячэння, — адзначыла Наталля Жукава.

— У Беларусі вельмі высокі ўзровень даступнасці новых прэпаратаў для лячэння туберкулёзу, добра падрыхтаваныя кадры. Але нават калі мы ўсіх забяспечым новымі прэпаратамі, новымі методыкамі дыягностыкі, мы не дасягнем стапрацэнтнага поспеху ў лячэнні. Штогод у нас каля 10 % пацыентаў «губляецца» — у многіх ёсць спадарожныя хваробы, у прыватнасці, залежнасць ад алкаголю, наркатычных прэпаратаў, некаторыя не вытрымліваюць працяглага шматмесячнага лячэння, — лічыць **каардынатар праграм па інфекцыйных хваробах краінавага офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Вячаслаў ГРАНЬКОЎ.** — Таму падтрымка пацыенцкіх арганізацый вельмі важная, яны дапамагаюць хвораму застацца на лячэнні. Такое ўзаемадзеянне паміж дзяржаўнымі і недзяржаўнымі арганізацыямі надзвычай эфектыўнае.

У грамадскіх арганізацый ёсць унікальная роля — ранняе выяўленне туберкулёзу, бо ў іх ёсць доступ да тых людзей, якія самі не прыйдуць да ўрача, падкрэслівае **Данііл КАШНІЦКІ, менеджар па развіцці патэнцыялу згуртаванняў Еўрапейскай кааліцыі па барацьбе з туберкулёзам.**

— Гэта першы дыялог, у якім удзельнічае вялікая група пацыентаў, што перанеслі гэта захворванне. Яны як ніхто іншы добра ведаюць, як арганізавана супрацьтуберкулёзная дапамога і чаго ёй не хапае, — лічыць эксперт.

Самай вялікай праблемай на сёння не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй постсавецкай прасторы спецыялісты называюць працяглае лячэнне ў стацыянары. Альтэрнатывай, на іх думку, павінна стаць амбулаторная дапамога. З 2018 года ў Брэсцкай вобласці рэалізоўваўся пілотны праект, накіраваны ў тым ліку і на скарачэнне стацыянарнага знаходжання хворых.

Летась у Беларусі было выяўлена больш за 1900 новых выпадкаў туберкулёзу. Цяпер смяротнасць ад гэтай інфекцыі складае 2,6 чалавека на 100 тысяч насельніцтва. Пры гэтым яшчэ дзесяць гадоў таму яна была амаль у шэсць разоў большая.

**Алена КРАВЕЦ.**

# З джалам навыперадкі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзе ж селяцца восы і шэршні? Яны выбіраюць месца для гнязда па некалькіх крытэрыях. Там павінна быць цёпла, зацішна і непадалёк вялікая колькасць ежы. Напрыклад, садавіны або нектару ў кветках.

— Нашы ратавальнікі выязджаюць у прыватныя дамы, у санаторыі, аздараўленчыя летнікі, дзіцячыя садкі, — працягвае Настасся Швайбовіч. — Так, 26 чэрвеня ратавальнікі адправіліся ў летнік «Лясная казка» Пухавіцкага раёна, які месціцца ў вёсцы Талька. Пад дахам двухпавярховага будынка было асінае гняздо, вось яно і было ліквідавана. 22 ліпеня было знята гняздо ў Пухавіцкім псіханеўралагічным дыспансеры. А 30 ліпеня ў вёсцы Ячонка Стаўбцоўскага раёна восы пасяліліся на прысядзібным участку.

Тут трэба разумець адзін нюанс. Ратавальнікі бясплатна здымуць гнёзды джаланосных насякомых у дзіцячых садках, дамах састарэлых і інвалідаў, бальніцах ды іншых сацыяльных установах. Калі ж гняздо знойдзена ў доме, на дачы, то жыхарам у гэтым выпадку будзе аказана платная паслуга. Справа ў тым, што гняздо не ўтвараецца за дзень ці два. Гэты працэс цягнецца як мінімум з красавіка. І калі восы збудавалі сабе кубло — значыць, гаспадар недзе не дагледзеў своечасова за парадкам, хоць абавязаны гэта рабіць. Аднак калі ёсць прамая пагроза жыццю і здароўю людзей або жыхары не могуць трапіць у дом з-за раз'юшаных насякомых, то работнікі МНС выязджаюць неадкладна і аказваюць дапамогу.

Пасля гэтага трэба правесці інспекцыю ўсіх шчылін, праз якія насякомыя маглі трапіць у памяшканне. Гэта могуць быць шчыліны на гарышчы, у падвалах, нішах або засценку. Іх пажадана запеніць. У гарадской забудове вялікую ўвагу трэба надаць балконам і месцам пад дахам.




### ЗДЫМАЕМ ГНЯЗДО ПРАВІЛЬНА

Важна ведаць: пачынаць самастойнае знішчэнне жытла джаланосных насякомых трэба толькі тады, калі вы стопрацэнтна ўпэўнены ў сваіх сілах. І калі вы дакладна ведаеце, што ў вас няма алергіі на яд асы або пчалы. Пры любых сумненнях лепш усё ж такі заплаціць невялікую суму грошай, але даверыцца прафесіяналам.

Перш чым пачынаць аперацыю «Ліквідацыя», трэба цалкам сябе абараніць, каб ніводнае насякомае не прабралася да цела і не ўджаліла. На вас абавязкова павінны быць маска пчалавода, пальчаткі, боты, вельмі шчыльны касцюм. Лепшы час для гэтага — вячэрні, калі ўсе восы збяруцца ў гняздзе. Аднак зацягваць мерапрыемства да глыбокай ночы ні ў якім разе не варта. Святло ад электрычнай лямпачкі або ад ліхтара тут жа абудзіць насякомых, якія пяройдуць у контратаку і пачнуць абараняць свой дом.

З сабой неабходна ўзяць вельмі шчыльны мяшок. Яго трэба адзець на гняздо і тут жа перапілаваць вострым нажом ножку, на якой яно трымаецца. А што рабіць з ім далей — залежыць ад вас. Гняздо можна ўтапіць, закапаць, спаліць... Але апошняе — толькі з усімі патрабаваннямі пажарнай бяспекі, без выкарыстання лёгкаўзгаральных вадкасцяў і выключна ў металічнай ёмістасці. А вось калі вы ўбачылі гняздо падчас шпацыру ў лесе, то лепш адтуль ціхенька сысці, каб не прыцягваць да сябе залішняй увагі з боку насякомых.

### КАЛІ БЕЗ УКУСУ НЕ АБЫШЛОСЯ

У атаку можа перайсці абсалютна любая джаланосная істота. Гэта можа быць дзе заўгодна — нават калі вы ясце нешта салодкае і выпадкова заглынулі кавалачак або напой разам з асой. Пры гэтым самае важнае — не разгубіцца, а рэагаваць як мага хутчэй.

— Першае, што трэба зрабіць, — гэта прыбраць джала, — раіць Настасся Швайбовіч. — Для гэтага падыдзе пінцэт або нават пластыкавая картка. Праўда, тут трэба ведаць адно «але». Восы джала не пакідаюць у чалавечай скуры, у адрозненне ад пчол. Месца ўкусу трэба апрацаваць і прыкласці да яго лёд або вельмі халодны прадмет. Калі ў вас пачынаецца пагаршэнне самаадчування — тут жа, не марудзячы, выклікайце хуткую дапамогу. Пакуль аказваецца дапамога, урачы размаўляюць з пацярпелым, каб упэўніцца, што ён не траціць прытомнасць.

У Беларусі здараліся выпадкі, калі людзі паміралі ад анафілактычнага шоку, выклікана алергіяй на атруту. Летась гэта адбылося ў Слуцкім раёне. 63-гадовая жанчына разам з мужам знаходзілася на лецішчы ў вёсцы Мялешкі. Яна варыла варэнне, калі муж, разграбаючы кучу саломы, патрывожыў асінае гняздо. Раз'юшаныя насякомыя некалькі разоў укусілі мужчыну, але ён не звярнуў на гэта асаблівай увагі. Пасля гэтага восы пераключыліся на жанчыну. Яе ўджалілі чатыры разы. У пенсіянеркі тут жа пачаўся анафілактычны шок. Неўзабаве яна памерла.

Актыўнасць вос, на шчасце, нядоўгая. Ужо ў верасні яна, як правіла, імкліва ідзе на спад. Таму застаецца проста перачакаць гэты перыяд.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14.

**Продавец:** ОАО «Витрайбыт», 211341, Витебская обл., Витебский р-н, аг. Вороны, ул. Ленинская, 36А, тел. +375 33 306-19-02, 53-84-95

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 200/С-75469 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Яновичский с/с, г.п. Яновичи, ул. Унишевского, д.10, площадью 131 кв. м, наименование: магазин, назначение: здание специализированное розничной торговли, расположенное на земельном участке с кадастровым № 221256200001000434 площадью 0,0467 га. Обременения: договоры аренды № 42 сроком до 05.11.2019 г., № 105 сроком до 08.03.2020, № 64 сроком до 15.12.2019, № 135 сроком до 02.01.2020 г. Нач. цена: 34 200,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 3 420,00 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона**: 09.09.2019 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 07.08.2019 с 8.30 по 06.09.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, BIC MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Условия аукциона: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить затраты за организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 N 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, оф. 5, www.cpo.by |
| Продавец | СУП «Гомельская СПМК-119» ОАО «Гомельоблстрой» г. Гомель, Кореневское шоссе, 4а |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 46 |
| Адрес ЭТП | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

| № Лота | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Шаг электронных торгов, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Механизм трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и гребенками, инв. № 70165 | 2 300,00 | 115,00 |
| 2 | Механизм трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и гребенками, инв. № 70164 | 2 300,00 | 115,00 |
| 3 | Механизм трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и гребенками, инв. № 70133 | 2 300,00 | 115,00 |
| 4 | ГАЗ-2705, 2007 г. в., гос. №АВ 0394-3 | 500,00 | 25,00 |
| 5 | ГАЗ-2705 242, 2003 г. в., гос. №АЕ 9226-3 | 500,00 | 25,00 |
| 6 | ГАЗ-2705 242, 2003 г. в., гос. №АЕ 9239-3 | 500,00 | 25,00 |
| 7 | ГАЗ-2705, 2008 г. в., гос. №АЕ 0555-3 | 800,00 | 40,00 |
| 8 | МАЗ 5336 А3 320, 2008 г. в., №АВ 8373-3 | 13 900,00 | 695,00 |
| 9 | ЗИЛ-ММЗ-4502, 1991 г. в., гос. № АЕ 9224-3 | 800,00 | 40,00 |
| 10 | ГАЗ-33081 ВКМ 317 01, 2008 г. в., гос. № АВ 8165-3 | 15 000,00 | 750,00 |
| 11 | МАЗ 5337 КС45729А4 02, 2009 г. в., гос. № АЕ 1645-3 | 23 400,00 | 1 170,00 |
| 12 | Экскаватор EW-1400 (объем ковша 1м³), 2008 г. в., гос. № ЕВ-3 1224 | 25 400,00 | 1 270,00 |
| 13 | Экскаватор цепной ЭТЦ-165А, базовое шасси трактор колесный МТЗ-82, 1988 г. в., гос. № ЕА 5574 | 1 700,00 | 85,00 |
| 14 | Машина бурильно-крановая БМ-205Д, базовое шасси трактор колесный МТЗ-82.1, 2008 г. в., гос. № ЕВ-3 0796 | 25 700,00 | 1 285,00 |

**Местонахождение лотов:** г. Гомель, Кореневское шоссе, 4а

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после электронных торгов |

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 12.09.2019** в **11.00**, каждый следующий лот с интервалом в 10 мин, на ЭТП **www.ipmtorgi.by**

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация)** по **10.09.2019** до **17.00** на ЭТП www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37, +375 44-704-92-06; auction@cpo.by |

# ЗМЯНІЦЬ ШКОЛУ І... СЯБЕ

**Гэта сумесны праект БПС-Ашчадбанка і Міністэрства адукацыі нацэлены на прыцягненне ў школы ў невялікіх гарадах і населеных пунктах крэатыўных і неабыякавых настаўнікаў, якія могуць і хочуць прыўнесці ў прафесію педагога новыя цікавыя ідэі, умеюць спраўляцца з цяжкасцямі, захоўваючы аптымізм, імкнуцца да самаразвіцця, гатовы да змен (у тым ліку і да пераезду на новае месца) і вераць у свае сілы.**




Першы набор праекта «Настаўнік для Беларусі».

## МАЛАДОСЦЬ І ВОПЫТ

Афіцыйны старт быў дадзены праекту ў чэрвені, але падрыхтоўка да яго вялася цэлы год. Штуршком стаў візіт у Беларусь старшыні праўлення Ашчадбанка Расіі Германа Грэфа. Ашчадбанк з'яўляецца галоўным донарам праграмы «Настаўнік для Расіі» і на справе дэманструе сацыяльную адказнасць бізнесу. Было вырашана пашырыць праект і на тэрыторыю Беларусі, дзе знаходзіцца даччыны БПС-Ашчадбанк. Тым больш што ўжо былі энтузіясты, якія даўно шукалі магчымасць, каб увасобіць гэту ідэю.

Да ўдзелу ў праекце «Настаўнік для Беларусі» запрашаліся як сёлетнія выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў, так і вопытныя настаўнікі. Першым крокам было запаўненне анкеты, затым кандыдатаў чакала скайп-інтэрв'ю, а на апошнім этапе — субяседаванне ў Мінску, падчас якога трэба было таксама правесці сяміхвілінны ўрок. Ключавымі крытэрыямі для адбору сталі камунікатыўныя навыкі кандыдатаў, іх гатоўнасць працаваць у камандзе і свядомая матывацыя (удзельнік павінен быў падзяляць каштоўнасці праекта). Усяго паступіла 60 заявак ад ахвотных змяняць школу і сябе. Для ўдзелу ў летнім інтэнсіве былі запрошаны 12 педагогаў. Сярод іх аказалася і вопытная **настаўніца беларускай мовы і літаратуры з аршанскай сярэдняй школы № 20 Алена ПАНКРАТАВА.** Па яе словах, яна прачытала артыкул аб праекце ў «Звяздзе» і паспела ўскочыць у апошні вагон. Яе заяўка прыйшла пасля ўсіх дэдлайнаў...

«Свежае адукацыйнае паветра мне было проста жыццёва неабходнае. Сваіх медыягеніяў — беларускі профільны клас — я выпусціла і думала, што мне няма чаго больш даць дзецям, раздала ўсё, адчувала, што трэба «напоўніцца», — кажа настаўніца. — Маладых, творчых, разумных, крэатыўных настаўнікаў у нашай краіне шмат. Але разбірацца са сваім крэатывам і творчасцю, час ад часу перажываючы памылкі, можна доўга і цяжка. І толькі вопытны педагог, азіраючыся на пачатак свайго прафесійнага шляху, разумее, наколькі важная на гэтым этапе прафесійнага росту дапамога і падтрымка старэйшых калег, здольных накіраваць жаданне моладзі працаваць па-новаму ў канструктыўны бок».

## СІГНАЛ З КОСМАСУ?

Летні інтэнсіў быў абавязковай умовай удзелу ў праекце. Цягам трох тыдняў на загараднай базе адпачынку БПС-Ашчадбанка як учарашнія выпускнікі, так і настаўнікі з салідным стажам навучаліся сучасным падыходам у педагогіцы і выкладанні, загартоўвалі свае лідарскія якасці, атрымлівалі веды ў галіне праектнага менеджменту і тайм-менеджменту. Кожны дзень быў напоўнены вызнымі мерапрыемствамі і сустрэчамі з цікавымі спікерамі.

— Заняткі распачыналіся раніцай і заканчваліся толькі бліжэй да ночы. Але ж трэба было яшчэ шмат чаго выканаць і паспець. Тэмп жыцця ў нас быў проста шалёны, — канстатуе **ўдзельніца праекта Алена АЛЕХНА.**

**У кожную школу накіроўваюцца па два ўдзельнікі праекта, бо разам з аднадумцам будзе прасцей асвойвацца на новым месцы.**

Дзяўчына хоць і мела педагагічны досвед (працавала педагогам-арганізатарам на ўстановах адукацыі ў Салігорску і Бабруйску), вышэйшую педагагічную адукацыю атрымала толькі сёлета. Скончыла завочна філфак БДУ. «Са мной нешта адбывалася, я разумела, што трэба ў жыцці штосьці змяняць — чарговы этап завяршыўся. Падумала, а ці не паехаць мне працаваць у вясковую школу? — кажа яна. — І вось, рыхтуючыся да чарговага экзамену, зайшла на старонку ў сацыяльнай сетцы да свайго выкладчыка і ўбачыла там абвестку аб наборы ў праграму «Настаўнік для Беларусі». Падумала, што, напэўна, гэта лёс, сігнал, які мне дасылаюць, тым больш што можна не толькі паспрабаваць сябе ў новай якасці, а яшчэ і чамусьці навучыцца. Вось толькі інфармацыя пра тое, што адбяруць усяго дванаццаць удзельнікаў, засталася спачатку без маёй увагі. Спужалася я ўжо пазней, калі адправіла на праект анкету...»

## ЗАХАПЛЯЙСЯ ДЗЕЦЬМІ!

Удзельніцамі «Настаўніка для Беларусі» сталі і **дзве Наталлі ЦЕЦЯРУК!** Настаўніцы працуюць у школе ў аграгарадку Павіцце ў Кобрынскім раёне.

— Мы замужам за роднымі братамі. Я выкладаю ў пачатковай школе, а сваячка — беларускую мову і літаратуру, — тлумачыць Наталля. — Мой педстаж складае 23 гады, таму для мяне самым складаным падчас летняга інтэнсіву было перагледзець свае погляды і падыходы ў прафесіі. Давялося нават крышачку сябе ламаць. Калі аналізавала свае дзеянні праз прызму гуманнай педагогікі, для мяне гэта было вялікае самапазнанне і самаразвіццё. Я атрымала інструменты, якія змагу прымяняць у далейшай рабоце. Увогуле дэвіз гуманнай педагогікі — «Прыйшоў у клас — захапляйся сваімі дзецьмі» — стане цяпер і маім дэвізам.

Дзве Наталлі застануцца працаваць у сваёй школе, якая падала заяўку на ўдзел у праграме «Настаўнік для Беларусі», толькі будуць мець цягам двух гадоў пастаянную метадычную і фінансавую падтрымку. Увогуле далучыцца да праекта пажадала каля 20 школ, іх геаграфія ахоплівае ўсе рэгіёны Беларусі, але прыняць апантаных настаўнікаў пашчасціла з іх толькі пяці: Лядзенскаму дзіцячаму саду — сярэдняй школе, Негарэльскай сярэдняй школе № 1, Дзяржынскай гімназіі № 1, Паплаўскаму дзіцячаму саду — сярэдняй школе (усе яны размешчаны на тэрыторыі Мінскай вобласці) і школе ў аграгарадку Павіцце на Брэстчыне.

Кожнаму настаўніку — удзельніку праграмы — акрамя зарплаты будзе два гады налічвацца стыпендыя ў памеры 250 рублёў. Іх таксама забяспечаць ноўтбукамі і кампенсуюць выдаткі на жыллё пры неабходнасці пераезду.

Алена Алехна накіруецца ў Негарэлае, а яшчэ адна **ўдзельніца Ала ГАЛУБКОВІЧ** (дзяўчына сама родам з Камянца) збіраецца пераехаць у Дзяржынск. Яна не мае пакуль педагагічнага стажу, бо толькі сёлета скончыла гістарычны факультэт у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце. Пра праект даведалася ад выкладчыкаў. Першапачаткова планавала ехаць па размеркаванні ў Лагойск, але цяпер яе жыццёвыя і прафесійныя планы змяніліся. «Для мяне падчас летняга інтэнсіву, напэўна, самым складаным было разабрацца ва ўсіх метадах і методыках і вылучыць з вялікай колькасці найбольш важнае, таму што ўсё хочацца апрабаваць. Але ж я разумею, што трэба выбудаваць нейкую сістэму», — канстатуе ўчарашняя выпускніца.

**Людміла АДАМОВІЧ** шэсць гадоў таму скончыла Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Машэрава, працавала да апошняга часу ў аграгарадку Будзілава ў Бешанковіцкім раёне, выкладала ў школе матэматыку і інфарматыку. Увесь час займалася валанцёрскай і краязнаўчай работай. Цяпер яна збірае чамаданы, каб накіравацца ў Ляды. Кажа, што муж яе падтрымаў, бо «людзі едуць працаваць нават у іншыя краіны, а яна ўсяго толькі змяняе Віцебскую вобласць на Мінскую». «Кожны дзень летняга інтэнсіву быў для мяне карысны і патрэбны, таму што я атрымлівала ідэі і матывацыю», — кажа настаўніца. Разам з ёй у Лядзенскую школу паедзе **Васіль ГЕМБІЦКІ, настаўнік фізічнай культуры** (месца яго ранейшай работы — Пінск). Трэба заўважыць, што ў кожную школу накіроўваюцца па два ўдзельнікі праекта, бо разам з аднадумцам будзе прасцей асвойвацца на новым месцы.

## НАЙЛЕПШЫЯ ДНІ Ў ЖЫЦЦІ

Бадай што самым адказным, самым складаным, але разам з тым самым яркім і запамінальным стаў летнік з дзецьмі на тэму «Навыкі XXI стагоддзя», які ўдзельнікі летняга інтэнсіву павінны былі самі спланаваць. Ён разгарнуўся на базе 20-й сярэдняй школы ў Барысаве. Дзеці ставілі хімічныя вопыты, праектавалі рашэнне розных экалагічных праблем, прыбіралі смецце ў лесе, здымалі відэаролікі аб праблемах, ад якіх можа прывесці адсутнасць здаровага ладу жыцця, фізічнай актыўнасці і правільнага харчавання, здзяйснялі экскурсіі, выратоўвалі Планету высокіх тэхналогій ад страшнага віруса...

Выхаванцы — 45 дзяцей са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў — былі падзелены на тры атрады. І з імі па першым часе не заўсёды было проста, але ў апошні дзень усе плакалі: і дзеці, і педагогі. Можна бясконца спрабаваць падбіраць словы, але ўсе яны ўсё роўна будуць не тыя, таму што для кожнага гэты дзень стаў асаблівым па-свойму: са сваімі эмоцыямі і сваімі слязамі. Гэтыя сем дзён змянілі ўсіх. «Найлепшыя ў іх жыцці дні», як сказалі самі дзеці. Яны не хацелі развітвацца з педагогамі і запрашалі тых у свае школы.

Першы этап праграмы «Настаўнік для Беларусі» завяршыўся. Вынікі летняга інтэнсіву падвялі ва ўрачыстай абстаноўцы ў БПС-Ашчадбанку.

— Не буду хаваць, што для нас гэты праект стаў своеасаблівым выклікам. Я заўсёды лічыў, што ў свеце ёсць шмат прафесій, якія з'яўляюцца і знікаюць, пра іх забываюць, але педагог — тая прафесія, якая ніколі не знікне, — разважае **старшыня Праўлення БПС-Ашчадбанка Ігар МЯРКУЛАЎ.** — Мы навучаліся ў школе ў тыя часы, калі настаўнік быў галоўнай крыніцай інфармацыі, тады не было інтэрнэту і сацыяльных сетак, быў толькі падручнік і педагог, і настаўнікам, напэўна, працавалася прасцей, а сёння нават шасцікласнік можа пратэсціраваць свайго педагога, адкрыўшы ў сецыве «Вікіпедыю». Таму роля настаўнікаў у сучасным свеце змяняецца. Яны павінны стаць людзьмі, якія матывуюць атрымліваць веды і навучацца ўсё жыццё. Цяпер за пяць гадоў адбываецца больш перамен, чым раней за стагоддзе. Да таго ж з'явіліся спецыяльнасці, якія адбіваюць жаданне працаваць у школе. «У айцішнікаў такія вялікія заробкі, таму трэба ісці ў IT», — прыкладна так думаюць маладыя людзі. Праграма «Настаўнік для Беларусі» — зона нашай сацыяльнай адказнасці, бо менавіта ад педагогаў залежыць будучыня Беларусі. Мы будзем гэты праект тыражаваць і маштабаваць.




Самым яркім і запамінальным стаў летнік з дзецьмі на тэму «Навыкі XXI стагоддзя».

## КЛЮЧАВЫ ЭЛЕМЕНТ — КАМАНДА

— Хочаш ісці хутка — ідзі адзін, а хочаш ісці далёка і доўга — ідзі разам. Кожны з нас у адзіночку класны і цікавы, але разам мы можам зрабіць намнога больш, — кажа **Алена МЕЛЬЧАНКА, менеджар адукацыйных праектаў, адзін з арганізатараў летняга інтэнсіву.**

— Праект насамрэч важны, і нам было цікава ўбачыць педагогаў, якія будуць прапагандаваць ідэі сучаснай школы, — прызналася **начальнік упраўлення па адукацыі Барысаўскага райвыканкама Марына САВЯНОК.** — Хачу пажадаць, каб у новых калектывах вы сталі сапраўднымі батарэйкамі, каб запальвалі сваімі ідэямі іншых, каб школа ўжо не змагла жыць як раней. І спадзяюся, што ў ідэі будзе шмат паслядоўнікаў і партнёраў.

Між іншым, ужо створаны мясцовы адукацыйны фонд «Новая школа». Яго дырэктарам стала настаўніца рускай мовы і літаратуры з мінскай гімназіі № 10 Таццяна КВЯЦІНСКАЯ, а старшынёй Папячыцельскага савета — намеснік старшыні праўлення БПС-Ашчадбанка Лілія АСТАПОВІЧ. Да праекта могуць далучыцца любыя кампаніі-донары, якія жадаюць зрабіць унёсак у развіццё якаснай адукацыі ў рэгіёнах.

Ёсць і першы афіцыйны партнёр праекта «Настаўнік для Беларусі» — анлайн-гіпермаркет 21vek.by. **Сузаснавальнік і намеснік дырэктара кампаніі Павел МАТУСЕВІЧ** кажа: «Я шчаслівы бачыць столькі зацікаўленых вачэй. Калі ахарактарызаваць ваш праект паняццямі са сферы бізнесу, то гэта стартап. А ў любым стартапе ключавы элемент — яго каманда. Я бачу сёння вочы, якія гараць. У стартапераў — гэта больш за палову поспеху... Адзінае, да чаго заклікаю, — не трэба даваць дзецям веды, самае важнае — гэта навык вучыцца. І да сваёй школы я стаўлюся менавіта як да месца, дзе я атрымаў гэты навык».

І напрыканцы колькі слоў пра тое, што чакае праект наперадзе. За кожным з удзельнікаў замацуюць куратара — вопытнага выкладчыка, да якога заўсёды можна будзе звярнуцца па дапамогу. Арганізатары плануюць, што кожную чвэрць навучальнага года ўсе будуць збірацца і падводзіць разам вынікі работы ў школах, абмяркоўваць праблемы, якія акрэсліліся, атрымліваць новыя веды і метадычную падтрымку. Першая такая сустрэча адбудзецца ўжо падчас асенніх канікул.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота прадастаўлена арганізатарамі праекта.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Сведения о результатах проведения рекламной игры «Выигрывай с Onliner 5»

1. Организатор рекламной игры:
Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220089, г. Минск, пр-т. Дзержинского, 5–613, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.
2. Сроки проведения рекламной игры:
Срок начала рекламной игры: 28.06.2019.
Срок окончания рекламной игры: 06.09.2019.
3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3584, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 13.06.2019.
4. Количество участников рекламной игры – 1236 чел.
5. Информация о призовом фонде:
Размер призового фонда рекламной игры составляет 4541,91 (четыре тысячи пятьсот сорок один белорусский рубль девяносто одна копейка).

| | Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., белорусских рублей, с НДС | Всего стоимость, белорусских рублей, с НДС |
|---|---|---|---|---|
| Приз 1 | Мобильный телефон (смартфон) HONOR 10 Lite 3GB/32GB (HRX-LX1) Sky Blue | 3 | 399,0 | 1197,0 |
| | Денежные средства в размере | | 40,05 | 120,15 |
| Приз 2 | Фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 | 10 | 84,576 | 845,76 |
| Приз 3 | Фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) | 50 | 47,58 | 2379,0 |
| Итого: | | | | 4541,91 |

**Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.**
**6. Информация о победителях рекламной игры:**

| № п/п | Фамилия, инициалы победителя | Сведения о выигрыше |
|---|---|---|
| 1 | Таберка Зьміцер Мікалаевіч | Приз 1 – мобильный телефон (смартфон) HONOR 10 Lite 3GB/32GB (HRX-LX1) Sky Blue, денежные средства в размере 40,05 бел. руб. |
| 2 | Рожновский Максим Петрович | Приз 1 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном XIAOMI MI BAND 3мобильный телефон (смартфон) HONOR 10 Lite 3GB/32GB (HRX-LX1) Sky Blue, денежные средства в размере 40,05 бел. руб. |
| 3 | Клыш Людмила Николаевна | Приз 1 – мобильный телефон (смартфон) HONOR 10 Lite 3GB/32GB (HRX-LX1) Sky Blue, денежные средства в размере 40,05 бел. руб. |
| 4 | Ткач Вадим Игоревич | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 5 | Сачек Илья Николаевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 6 | Сорокин Дмитрий Валерьевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 7 | Козел Сергей Васильевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 8 | Горский Игорь Николаевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 9 | Бордон Евгений Сергеевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 10 | Борель Максим Константинович | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 11 | Маков Максим Григорьевич | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 12 | Рабиновский Максим Александрович | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 13 | Марчук Светлана Павловна | Приз 2 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 |
| 14 | Кузьмицкий Станислав Иосифович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 15 | Кожан Дмитрий Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 16 | Шевчук Валентин Валентинович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 17 | Демьянков Дмитрий Анатольевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 18 | Смирнов Валерий Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 19 | Цалко Валерий Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 20 | Конончук Сергей Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 21 | Каско Владимир Сергеевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 22 | Кучейко Сергей Чеславович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 23 | Колин Илья Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 24 | Круковский Дмитрий Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 25 | Мякишев Дмитрий Михайлович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 26 | Капустин Андрей Юрьевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 27 | Свистунович Юрий Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 28 | Усов Александр Андреевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 29 | Дубровский Андрей Владимирович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 30 | Шашков Илья Юрьевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 31 | Жарко Степан Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 32 | Лозицкий Эдуард Сергеевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 33 | Талецкий Евгений Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 34 | Шпак Сергей Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 35 | Гололобов Владислав Юрьевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 36 | Янцевич Денис Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 37 | Янцевич Денис Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 38 | Янцевич Денис Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 39 | Носик Дмитрий Константинович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 40 | Соломонов Сергей Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 41 | Паплёвка Илья Викторович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 42 | Юркова Екатерина Борисовна | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 43 | Юркова Екатерина Борисовна | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 44 | Бречко Алексей Иванович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 45 | Яршевич Сергей Викентьевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 46 | Аладьев Андрей Юрьевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 47 | Пацкалев Дмитрий Анатольевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 48 | Будько Олег Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 49 | Мазанович Андрей Васильевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 50 | Штоколов Сергей Николаевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 51 | Рыжков Дмитрий Сергеевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 52 | Слабко Ольга Викторовна | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 53 | Тетеруков Александр Михайлович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 54 | Рыдевский Евгений Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 55 | Рыдевский Евгений Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 56 | Лозовский Геннадий Антонович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 57 | Петрушенко Кирилл Васильевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 58 | Смелякова Арина Петровна | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 59 | Волков Антон Петрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 60 | Ерёмин Илья Юрьевич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 61 | Мороз Александр Артёмович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 62 | Бенедищук Алексей Игоревич | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |
| 63 | Корнилов Павел Александрович | Приз 3 – фитнес-браслет (умные часы) с экраном Honor Band 4 Running (AW70) |

7. Для получения призов победители должны явиться не позднее 06.09.2019 (включительно) по адресу: г. Минск, пр-т. Дзержинского, 5 – офис 613, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона: + 375 (29) 514 35 24.

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 02.09.2019 повторного аукциона (цена снижена на 50 %)

**Лот № 1:** 76/1000 долей капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 1.1, инв № 1000093300, площадью 28,23 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м).
**Начальная цена продажи: 6 205,63 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 620,56 руб.**

**Лот № 2:** 82/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 1.2, инв № 1000093400, площадью 30,47 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м).
**Начальная цена продажи: 6 694,23 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 669,42 руб.**

**Лот № 3:** 44/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 3.1, инв № 1000093700, площадью 16,27 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,21 кв. м). Ворота Р 1770-АС, инв. № 2030091000.
**Начальная цена продажи: 3 990,45 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 399,05 руб.**

**Лот № 4:** 44/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 3.2, инв № 1000093800, площадью 16,38 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,21 кв. м). Ворота Р 1770-АС, инв. № 2030090900.
**Начальная цена продажи: 4 014,44 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 401,44 руб.**

**Лот № 5:** 71/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 7, инв № 1000094300, площадью 26,20 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС, инв. № 2030092000.
**Начальная цена продажи: 6 227,05 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 622,71 руб.**

**Лот № 6:** 79/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 8, инв № 1000094400, площадью 29,40 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС, инв. № 2030092100.
**Начальная цена продажи: 6 925,05 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 692,51 руб.**

**Лот № 7:** 48/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 10, инв № 1000094600, площадью 17,77 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС, инв. № 2030091900.
**Начальная цена продажи: 4 373,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 437,30 руб.**

**Лот № 8:** 42/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 11.1, инв № 1000094700, площадью 15,45 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС, инв. № 2030091800.
**Начальная цена продажи: 3 882,22 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 388,22 руб.**

**Лот № 9:** 42/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 – Здание гаражей на 20 автомашин (машино-место № 11.2, инв № 1000094800, площадью 15,45 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м).
**Начальная цена продажи: 3 418,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 341,80 руб.**

Имущество расположено по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 28г, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005003209, общей площадью 0,1032 га

**Дата, время и место проведения аукциона: аукцион состоится 2 сентября 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Прием заявлений (подаются лично): по 30.08.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «Могилевхимволокно», УНП 700117487, Могилевская обл., г. Могилев-35, 8-0222-499-047

**Расчетный счет для внесения задатка:** Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

**Справочно для покупателей:** Регистрация купли-продажи доли в РУП «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» будет осуществляться на основании договора купли-продажи, при этом технический паспорт на имущество (долю) не изготавливается.
В случае отчуждения приобретенного имущества (доли) другому покупателю преимущественное право его приобретения имеют другие дольщики здания гаражей. При регистрации сделки купли-продажи имущества (доли) необходимым будет условие предоставления Могилевским горисполкомом в аренду земельного участка, на котором расположено имущество

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 07.04.18, от 23.05.18, от 22.06.18, от 12.10.18, 02.03.19, 22.03.19, 04.05.19

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352,
**тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56, Mogilev@ino.by**

## Информация о совершении крупной сделки:

- полное наименование и местонахождение акционерного общества:

**Закрытое акционерное общество «Амкодор-Спецсервис»**, 220003, г. Минск, ул. Брикета, 39, а/я 4,

- дата принятия решения о совершении сделки: 2 августа 2019 года;

- вид сделки (каждой из взаимосвязанных сделок): договор поручительства;

- предмет сделки: поручительство за ООО «Амкодор-Онего» перед ОАО «Промагролизинг» по внешнеторговому договору купли-продажи;

- сумма сделки (общая сумма взаимосвязанных сделок): 142 187 640,00 российских рублей;

- балансовая стоимость активов (стоимость активов), определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период, предшествующий дню принятия решения о совершении такой сделки (стоимости активов): на 01.07.2019 – 17 794 тыс. рублей.

УНП 100187680

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже бензохранилища, принадлежащего ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов»

**Лот № 1.** Бензохранилище, инв. № 621/С-32564. Площадь – 98,6 кв. м. Наименование объекта в соответствии с данными Государственного списка историко-культурных ценностей Республики Беларусь: недвижимая материальная историко-культурная ценность «Фольварок «Альба»: погреб. Минская область, Несвижский район, п. Альба, ул. Заводская, 1 (шифр 612Г00658), без категории, в составе материально недвижимой историко-культурной ценности категории 2. Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, п. Альба, ул. Заводская, д. 1. **Начальная цена, бел. руб. – 6 861,24 с НДС. Задаток, бел. руб. – 686,12. Шаг аукциона – 5 %**

Земельный участок площадью 0,0191 га с кадастровым номером 624283500601000093. Право постоянного пользования.

**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. 2. Оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания договора купли-продажи. 3. Подписать в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня приобретения права собственности на недвижимое имущество охранное обязательство. 4. Возместить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

**Аукцион состоится 09.09.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов», Минская обл., Несвижский р-н, п. Альба, ул. Заводская, д. 1, тел. 8 (01770) 6-20-61. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, г. Минск. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 09.09.2019 (ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 05.09.2019 в 11.00. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения. Контактное лицо для осмотра Объекта: Шинкевич Роман Геннадьевич, тел. 8 (01770) 6-20-12

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by e-mail: torgi@ino.by**

**РУП «Торговый дом «Восточный»** снимает с аукциона, который состоится 08.08.2019 Лот № 11. Капитальное строение с инвентарным номером 612/С-6270 общей площадью 549,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Московская, 64Б. Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: расширение собственной базы. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 641300000003001086 площадью 0,3918 га. **Начальная цена продажи – 65 386,83 белорусского рубля, задаток – 6 538,68 белорусского рубля. Шаг аукциона – 5 %.** Извещение о проведении аукционных торгов было опубликовано 24.07.2019 в печатных средствах массовой информации – газета «Звязда» № 137.

УНП 101127633

Сугучча

# ПРА БАЦЬКАВУ СПАДЧЫНУ, БЛІЗКАГА КЛАСІКА І ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ

## Узбекістанскі прафесар з беларускімі каранямі — пра повязь двух народаў і літаратур

**У 30-я гады мінулага стагоддзя беларускі паэт Сцяпан Ліхадзіеўскі, ураджэнец вёскі Барок на Случчыне, абвінавачаны ў «контррэвалюцыйнай нацдэмаўскай дзейнасці», быў высланы з Беларусі ў Казахстан. Але і там, і ва Узбекістане, з якім звязаны далейшы лёс паэта, ён працягваў пісаць вершы, вывучаць і перакладаць літаратуру — беларускую, рускую, узбекскую, французскую. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён пасябраваў з народным паэтам Беларусі Якубам Коласам, які быў эвакуіраваны з сям'ёй у Ташкент, і шмат зрабіў для папулярызацыі беларускай паэзіі... А пазней цікавасць да літаратуры перайшла ў спадчыну і да яго сына. Анатоль ЛІХАДЗІЕЎСКІ — прафесар Узбекістанскага ўніверсітэта сусветных моў, доктар філалагічных навук, які амаль 50 гадоў працягвае сямейную філалагічную традыцыю. Прычым робіць гэта так паспяхова, што летась быў адзначаны высокай дзяржаўнай узнагародай — ордэнам «Дружба» — за ўмацаванне сяброўства, братэрства і ўзаемнай згоды паміж прадстаўнікамі ўсіх нацый і народнасцяў.**



Фота Канстанцыі ДРОБАВА.

Сёлета прафесар наведаў Беларусь падчас Дзён культуры Узбекістана ў нашай краіне, каб абмеркаваць з землякамі магчымасці творчага і навуковага супрацоўніцтва. А яшчэ спраўдзіў даўнюю мару — пабываць на радзіме бацькі. Дакладней, у Слуцкім краязнаўчым музеі, куды жонка Сцяпана Ліхадзіеўскага перасылала некалі памятныя фотаздымкі, перапіску з Коласам, чарнавікі вершаў, асабістыя рэчы і г. д. «Мне абавязкова трэба там усё сфатаграфаваць і паказаць потым сваякам, інакш не зразумеюць: як так, быць у Беларусі і не з'ездзіць на бацькаву малую радзіму?»

— Папярэдні раз я быў у Мінску ў студэнцкія гады, у 1972-м, — згадвае Анатоль Сцяпанавіч. — Тады мы з бацькам кватаравалі ў ягонага сябра, паэта Станіслава Шушкевіча, на вуліцы Цнянскай... Ці захавалася яна яшчэ?

**— Захавалася, і на тым жа самым месцы. А як вам наогул Мінск праз больш чым 40 гадоў?**

— Часу пахадзіць пешкі было няшмат, але ў вольную хвілінку я ўсё ж прагуляўся. І ведаеце, такое ўражанне, што гэта той самы Мінск. У Ташкенце, калі прыехаць сёння і праз пяць гадоў, то горад наўрад ці пазнаеце, настолькі там змяняюцца вуліцы, і цяпер старога Ташкента наогул няма. А ў вас, наадварот, гуляеш па цэнтры і суцэльная настальгія, настолькі знаёмыя месцы. Здзівіла, што засталіся гэтыя савецкія назвы: вуліца Леніна, Энгельса — ва Узбекістане такога не знойдзеце.

> **«Калі народы чытаюць вершы, яны ваяваць не будуць, бо вайна пачынаецца ад тупасці і бездухоўнасці, нежадання зразумець іншага. Але ў беларусаў з гэтым праблем няма, і многім варта было б у вас павучыцца прыязнасці ды адкрытасці да іншых».**

## «ДЗЕСЯЦЬ КІЛО КАЛАСЯЦІНЫ»

**— Кажуць, што дзіцячыя ўражанні — самыя моцныя. Але вы былі зусім маленькім хлопчыкам, калі не стала Якуба Коласа, і, мабыць, яго зусім не помніце?**

— Затое я шмат чуў пра яго ад бацькі, сам распытваў тое-сёе, чытаў публікацыі (так, у бацькі выйшаў зборнік публіцыстычных работ «Радасць сустрэч», і там два артыкулы якраз прысвечаныя жыццю Якуба Коласа ў Ташкенце) і склаў для сябе партрэт гэтага вялікага паэта — асабісты, не па падручніках. Бацька расказваў пра Коласа як чалавека вельмі жыццярадаснага і вясёлага, нягледзячы ні на якія выпрабаванні. Пачуццё гумару ён захоўваў нават у цяжкі час вайны — напрыклад, жартаваў, што ў Ташкенце тэмпература заўжды, як у бутэльцы гарэлкі, 40 градусаў. Альбо бацька расказваў: Колас вельмі перажываў — і за ўсю родную краіну, і за сяброў, і блізкіх, яму не раз даваліся перанесці асабістыя трагедыі, — а таму вельмі схуднеў. Але і тут не траціў прысутнасці духу, трапна заўважаючы, маўляў, «дзесяць кіло каласяціны прапала»...

> **«Наогул ва Узбекістане вялікая цікавасць да літаратуры: у нас ёсць цэлая Алея літаратараў у Нацыянальным парку, ёсць шмат цікавых помнікаў, а ў ташкенцкім метро ці не палова станцый маюць літаратурныя назвы...»**

Дарэчы, карыстаючыся выпадкам, хачу выправіць недакладнасць, якую бачыў і ў беларускім, і ва ўзбекістанскім друку. Бацьку і Якуба Коласа некаторыя называюць сакурснікамі, а гэтага быць не магло, бо паміж імі амаль 15 гадоў розніцы ва ўзросце — і бацька яшчэ 16-гадовым юнаком трапятаў перад вялікім паэтам, а пасябравалі яны значна пазней.

## ЧЫТАЦЬ І СЛУХАЦЬ

**— Узбекістанскія калегі сцвярджаюць, што вашым спецкурсам па літаратуры славянскіх краін студэнты проста заслухоўваюцца. Каго з беларускіх аўтараў уключылі ў лекцыі і семінары?**

— Курс я выбудоўваў як мікрагісторыю. Справа ў тым, што на Беларусь адводзілася, здаецца, усяго чатыры гадзіны лекцый, і ў гэты час уваходзіў агляд гісторыі беларускай літаратуры — праз «Тараса на Парнасе», Максіма Багдановіча, Цётку я паступова выходзіў на сярэдзіну ХХ стагоддзя, там, безумоўна, расказваў пра Якуба Коласа і Янку Купалу і напрыканцы гаварыў крыху пра сучасных літаратараў — прынамсі тых, пра каго я ведаю: Васіль Быкаў, Іван Шамякін і іншыя. Пры гэтым стараўся, расказваючы пра савецкі перыяд, не прадстаўляць аўтараў як апявальнікаў савецкай рэчаіснасці, а арыентавацца на самабытную частку іхняй творчасці, абапіраўца на фальклор. Так, у выпадку з Янкам Купалам выбраў паэму «Курган» — безумоўны шэдэўр, да таго ж на занятках мы спецыяльна вылучалі яшчэ 15 хвілін і слухалі фрагменты «песняроўскай» рок-оперы «Гусляр», напісанай паводле гэтага твора. Эфект ад спалучэння неверагоднай музыкі, геніяльнага тэксту і геніяльнага выканання атрымліваўся стапрацэнтны, студэнты сапраўды слухалі, раскрыўшы рот...

У маім спецкурсе лекцый і семінараў не было толькі маладога пакалення паэтаў і пісьменнікаў, бо мне, знаходзячыся ва Узбекістане, цяжка зарыентавацца, хто цяпер найбольш папулярны ў Беларусі, пра каго варта гаварыць. З дапамогай інтэрнэту даведаешся далёка не пра ўсіх, а афармляць падпіску на літаратурна-мастацкія выданні — справа дарагая, бо мы жывём у розных дзяржавах, а таму беларуская літаратура для нас ва Узбекістане сёння — замежная. Хоць для мяне, па вялікім рахунку, менавіта яна родная. І ў гэты прыезд я накупіў шмат беларускіх літаратурных часопісаў, дамовіўся з некаторымі рэдактарамі, каб атрымліваць PDF-версіі, так што, мяркую, можна будзе дапоўніць курс новымі імёнамі.

**— Падчас Дзён культуры Узбекістана шмат гаварылі пра ўзаемныя пераклады беларускіх аўтараў на ўзбекскую і наадварот. Асабіста вам якіх пісьменнікаў і паэтаў цікава было б пачытаць у перакладзе?**

— Беларусаў — усіх сучасных папулярных аўтараў, бо я з імі амаль незнаёмы. Што да ўзбекскай літаратуры, тут таксама ёсць цэлы шэраг імёнаў, вартых увагі і перакладу: класічныя паэты ХХ стагоддзя Абдула Арыпаў, Эркін Вахідаў, цудоўная проза Аскада Мухтара. Канешне, адэкватна перакладаць паэзію складана. Нездарма яшчэ ў савецкія часы хадзіла эпіграма «Пры ўсім пры тым, пры ўсім пры тым, пры ўсім пры тым, пры тым Маршак застаўся Маршаком, а Роберт Бёрнс — паэтам». І ўсё ж узаемныя пераклады — справа перспектыўная, якая дапамажа лепш ведаць адно аднаго. Наогул ва Узбекістане вялікая цікавасць да літаратуры: у нас ёсць цэлая Алея літаратараў у Нацыянальным парку, ёсць шмат цікавых помнікаў, а ў ташкенцкім метро ці не палова станцый маюць літаратурныя назвы... Такое захаванне культуры вельмі важнае, і, на маю думку, каб быць сапраўды культурным чалавекам, трэба ведаць літаратуру розных народаў, а не ігнараваць іх з палітычных ці іншых прычын.

## ПРА «САМАСЦЬ» І ДРУЖБУ НАРОДАЎ

**— Ваш бацька вядомы не толькі як беларускі паэт, але і як даследчык і перакладчык нямецкай і французскай літаратуры. Вы шмат гадоў аддалі вывучэнню літаратуры амерыканскай, пры гэтым жывяце і працуеце ў атачэнні ўзбекскай мовы і літаратуры. Абагульняючы ўвесь гэты літаратуразнаўчы вопыт, якія рысы, на ваш погляд, вызначаюць характар беларускай літаратуры?**

> **«Пэўная туга і настальгія, уласцівыя беларускай літаратуры, цалкам вытлумачальныя, бо гэта адлюстраванне народнага гора. І нічога дрэннага ў гэтым няма, наадварот, гэта пашана да ўсіх тых, хто загінуў і пацярпеў у мінулых войнах, якую не заменіць голы ўра-патрыятызм».**

— Мне даводзілася ўдзельнічаць у дыскусіях на гэту тэму і, у прыватнасці, чуць такія заўвагі: шмат гадоў прайшло, а ў беларусаў усё партызаны, вайна — навошта? І я адказаў наступным чынам: «Гэта такая рана, якая вельмі доўга не загойваецца. Вы не зразумееце гэтага, калі там не жылі альбо не маеце родных сярод беларусаў. Наколькі я ведаю, у вёсках і дагэтуль расказваюць, хто са сваякоў партызаніў, а чые родзічы ў паліцаях служылі, хоць змянілася ўжо чацвёртае пакаленне. Праз Беларусь праходзілі, лічы, усе сусветныя войны, хто толькі не таптаў гэтую зямлю...» Таму пэўная туга і настальгія, уласцівыя беларускай літаратуры, цалкам вытлумачальныя, бо гэта адлюстраванне народнага гора. І нічога дрэннага ў гэтым няма, наадварот, гэта пашана да ўсіх тых, хто загінуў і пацярпеў у мінулых войнах, якую не заменіць голы ўра-патрыятызм. Згадайце творы Васіля Быкава — у іх няма гумару, хіба паратройка «чорных» франтавых усмешак, бо вайна для яго, пісьменніка-франтавіка, — бесчалавечная з'ява, дзікунская і абсурдная... І таму Быкаў — сапраўдная, вялікая літаратура, як і Янка Купала, і Якуб Колас. Я на нядаўнім адкрыцці помніка Алішэру Наваі ў Мінску сказаў, як гэта цудоўна: людзі сабраліся ля помніка вялікаму паэту і чытаюць вершы, тут будуць чытаць Наваі, у Ташкенце — чытаць Коласа. А калі народы чытаюць вершы, яны ваяваць не будуць, бо вайна пачынаецца ад тупасці і бездухоўнасці, нежадання зразумець іншага. Але ў беларусаў з гэтым праблем няма, і многім варта было б у вас павучыцца прыязнасці ды адкрытасці да іншых. У вас менталітэт такі — стрыманы, спакойны, шмат у чым блізкі да ўзбекістанскага, і таму нашы народы лёгка сыходзяцца і разумеюць адзін аднаго.

**— У адным з вершаў Сцяпана Ліхадзіеўскага ёсць такія радкі: «Жыве ў Ташкенце чвэртку веку, не знае, дзе закончыць век. Ён беларус паміж узбекаў, між беларусаў ён — узбек»... А кім вы сябе адчуваеце — узбекскім беларусам, беларускім узбекам?**

— Сынам свайго бацькі, — смяецца прафесар. — Дарэчы, ці ведаеце, што менавіта гэтыя словы, толькі на рускай, выбіты на магіле бацькі? Мы так вырашылі з сям'ёй, бо бацька быў перакананым інтэрнацыяналістам, ён паважаў усе народы. У Беларусі яго сапраўды жартам празвалі «ўзбекам», што яму вельмі падабалася. А ў Ташкенце ўсе, і ўзбекскія паэты, і рускамоўныя ў нас дома сядзелі за сталом — вось гэта і ёсць дружба народаў у маім разуменні.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

# Насустрач парам, якія робяць ЭКА

## У Мінску рэфармуюць цэнтр планавання сям'і

**Сталічны цэнтр планавання сям'і сёлета вырашана рэфармаваць. У абноўленым выглядзе ён сустрэне наведвальнікаў ужо ў верасні.**

З пачатку бягучага года там вылучана 15 стацыянарных ложкаў для пацыентаў, якія рыхтуюцца стаць бацькамі пры дапамозе ЭКА, расказала галоўны акушэр-гінеколаг камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ірына Ікачастасава. А да восені павялічаць колькасць урачоў-спецыялістаў, каб жанчыны пасля прымянення дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій назіраліся тут жа, а не ў сваёй жаночай кансультацыі, як адбывалася раней. Цэнтр будзе працаваць у дзве змены, што забяспечыць даступнасць медыцынскай дапамогі ўсім ахвотным. Падчас родаў і пасля іх жанчыны атрымаюць дапамогу ў 2-м радзільным доме, на базе якога і функцыянуе цэнтр.



Рэфармаванне цэнтра, па сутнасці, — крок насустрач парам, якія карыстаюцца дапаможнымі рэпрадуктыўнымі тэхналогіямі. Для кожнай з іх цяжарнасць, якая надышла часам не з першай спробы ЭКА, чаканая і жаданая. І кожная з такіх жанчын хоча назірацца ва ўрачоў, якія займаюцца рэпрадуктыўнымі тэхналогіямі.

Летась у Мінску пры дапамозе ЭКА нарадзілася 600 дзяцей. У Беларусі, як і ў іншых краінах, прыблізна 14 % бясплодных сямейных пар. Пры гэтым у 50 % выпадкаў бясплодныя жанчыны, у 50 % — мужчыны. Сёння ў Мінску першае дзіця жанчыны нараджаюць прыблізна ў 29 гадоў, другое — у 32—33. Мужчыны ў сталіцы ўступаюць у шлюб у сярэднім у 28 гадоў. Час стварэння сям'і ссоўваецца на больш позні ўзрост, як і момант, калі пара вырашае нарадзіць дзіця.

Гарадскі цэнтр планавання сям'і, у тым ліку кабінет дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, дзе выконваецца ЭКА, працуе на базе гарадскога клінічнага раддома № 2 з 2008 года. Сюды з гарадскіх паліклінік накіроўваюць пары, якія сутыкнуліся з праблемай бясплоднасці.

А з 3 жніўня ў сталіцы стартаваў медыкасацыяльны праект «Марафон жаночага здароўя — 2019». Мерапрыемствы арганізаваны як у раддамах, так і ў буйных гандлёвых цэнтрах сталіцы. З удзельнікамі акцыі сустрэнуцца ўрачы розных спецыяльнасцяў: гінеколагі, кандыёлагі, эндакрынолагі, мамолагі, анколагі, дыетолагі, педыятры, псіхолагі. У раддамах арганізуюць сустрэчы з цяжарнымі і іх партнёрамі, дзе яны пабачаць, у якіх умовах будуць нараджаць, і змогуць задаць пытанні па родах і доглядзе малых.

Скажыце, доктар...

# КАЛІ ЖОЎЦЬ ЗАСТАЯЛАСЯ

## Што трэба ведаць пра захворванні жоўцевага пузыра

**Згодна са статыстыкай, пасля 45 кожны дзясяты мужчына і кожная чацвёртая жанчына пакутуюць на хранічны халецыстыт. Пасядзелі за святочным сталом, выпілі-закусілі, і стала дрэнна — млосна, паколвае справа пад рэбрамі. Прыняў таблетку-другую, і здаецца, усё прайшло. А між іншым, менавіта такімі могуць быць першыя сігналы халецыстыту, аднаго з самых распаўсюджаных захворванняў жоўцевага пузыра.**

Галоўная функцыя гэтага грушападобнага органа — назапашванне, канцэнтрацыя і выдзяленне жоўці, якая ўтвараецца ў выніку прыёму ежы. Затым праз жоўцевы пратокяна трапляе ў дванаццаціперсную кішку, дзе стварае неабходныя ўмовы для актыўнасці ферментаў, растварае тлушчы, спрыяючы іх усмоктванню. Яна дапамагае засваенню шэрагу жыццёва важных вітамінаў, стымулюе сакрэцыю падстраўнікавага соку, адным словам, з'яўляецца сапраўдным дырыжорам стрававання. Што адбываецца, калі гэты орган выходзіць са строю? Пра хваробы жоўцевага пузыра мы паразмаўлялі з **загадчыкам 2-га тэрапеўтычнага аддзялення 11-й гарадской паліклінікі Мінска Таццянай ПЕНКАЛЬ** *(на фота).*

***— Таццяна Уладзіміраўна, якія самыя распаўсюджаныя хваробы жоўцевага пузыра?***

— Адна з іх — хранічны халецыстыт. Ён сустракаецца ў дзвюх формах: бескамянёвым халецыстытам займаецца пераважна тэрапеўтычная служба, а пры жоўцекамянёвай хваробе —хірургічная, якая праводзіць аперацыйнае і постаперацыйнае лячэнне. Таксама нярэдка сустракаюцца запаленчыя хваробы жоўцевых шляхоў — халангіты. І, напэўна, трэба сказаць пра не самае распаўсюджанае, але частае захворванне, прычым у людзей маладога ўзросту — дыскінезію (парушэнне маторыкі) жоўцевыводных шляхоў. Гэта захворванне псіхасаматычнага характару, але ні ў якім разе не псіхічнае расстройства. У пацыента маюцца скаргі на болі ў жываце, правым падрабер'і, горыч у роце. Але калі праводзім даабследаванне, у прыватнасці УГД, то адпаведных структурных парушэнняў жоўцевага пузыра і пратокаў мы не выяўляем. Атрымліваецца, што на фоне моцнай стрэсавай сітуацыі нашы псіхічныя структуры пачынаюць уздзейнічаць на маторыку жоўцевых шляхоў.

> **«Правае падрабер'е можа балець не толькі ад хвароб жоўцевага пузыра. А, у прыватнасці, ад таго, што мы няправільна сядзім за сталом».**

***— Як гэта адбываецца?***

— Рух жоўці абумоўлены маторыкай. Для таго каб яна рухалася з жоўцевага пузыра, ён павінен скарачацца — гэтак жа, як і пратокі. Падчас стрэсавай сітуацыі — гэта можна заўважыць нават на УГД — пратокі скарачаюцца ў паскораным тэмпе. Узнікае болевы сіндром, таму што жоўць выкідваецца або не ў поўным аб'ёме, або празмерна. Бывае адваротная сітуацыя, калі працэс замаруджваецца: паступае вялікая колькасць ежы, а жоўці недастаткова. І ў тым, і ў другім выпадку праз няправільную маторыку жоўцевых шляхоў можа ўтварыцца застой жоўці. Такое захворванне абумоўлена нашым псіхалагічным станам, гэта кампенсаторная рэакцыя арганізма на стрэс. Яно сустракаецца ў людзей працаздольнага ўзросту, якія штодзень сутыкаюцца са стрэсавымі сітуацыямі. Боль узнікае, напрыклад, падчас паездкі ў аўтобусе на работу і з работы, у справаздачны перыяд і пры іншых сітуацыях.

***—— Калі стрэс знікае, захворванне праходзіць?***

— Часцей за ўсё так. Прычым пацыенты часта самі знаходзяць гэту ўзаемасувязь: калі на рабоце паспрачаюся з начальнікам, баліць правае падрабер'е. Але не трэба забываць, што правае падрабер'е можа балець не толькі ад хвароб жоўцевага пузыра. А, у прыватнасці, ад таго, што мы няправільна сядзім за сталом. Сціскаюцца або раздражняюцца нервовыя карэньчыкі міжрэберных нерваў, ад гэтага ўзнікае боль. Тут важна сачыць за гігіенай працы і сваёй пасадкай. Дзетак у школе прывучаюць правільна сядзець за партай, а вось у дарослым жыцці мы хутка пра гэта забываем і часта прымаем няправільныя позы.

***— Як сябе праяўляюць хваробы жоўцевага пузыра?***

— У захворванняў усёй жоўцевыводнай сістэмы адносна сімптомакомплекс. Гэта боль у правым падрабер'і, магчымы ён і ў зоне эпігастрыя — «пад лыжачкай», таксама з'яўляецца адчуванне горычы ў роце. Боль можа быць як пастаянны ныючы, так і часам вельмі моцны прастрэльваючы. Калі ён узнікае ўпершыню, можа быць рэзкі і інтэнсіўны — гэта так званая пячоначная коліка. Яна ўзнікае, калі каменьчык трапіў у пратокі перакрыў яго, тады адбываецца парушэнне адтоку жоўці. Калі пачынаецца запаленчы перыяд, пацыенты скардзяцца на павышэнне тэмпературы, пажаўценне скурных покрываў і склер. Хворыя, дарэчы, часта звяртаюцца па дапамогу нават не з-за болевага сіндрому, а менавіта таму, што заўважаюць, як змяніўся колер скуры, вачэй, падчас чысткі зубоў бачаць, што язык жоўты, абкладзены белым налётам. На болевы сіндром з улікам таго, што ў кожнага свой болевы парог, некаторыя не звяртаюць увагу.



***— Атрымліваецца, што прапусціць праблемы з жоўцевым пузыром, па сутнасці, немагчыма...***

— Так. Пацыенты так ці іначай заўважаюць змены і звяртаюцца да ўрача.

***— Здароўе жоўцевага пузыра залежыць ад нашага ладу жыцця? Ці да гэтага захворвання ўсе ж маецца генетычная схільнасць?***

— Шмат залежыць і ад нашага ладу жыцця, але ва ўсёй спецыяльнай літаратуры апісваецца спадчынная схільнасць. Прычым яна разглядаецца выключна на ўзроўні бацькоў, дзядулі-бабулі не бяруцца ў разлік. Калі збіраеш анамнез у пацыента, высвятляецца, што ў кагосьці з бацькоў былі аналагічныя праблемы. Адметна, што жоўцекамянёвая хвароба развіваецца часцей у жанчын, мужчыны на яе пакутуюць значна радзей. Акрамя спадчыннага фактару, уплываюць і наш лад жыцця, харчаванне.

***— Што не любіць жоўцевы пузыр?***

— З улікам таго, што ўвесь час некуды спяшаемся, мы не паспяваем правільна харчавацца. Асабліва моладзь ігнаруе частае і дробнае харчаванне, а гэта рана ці позна нагадвае пра сябе. Уся наша стрававальная сістэма любіць, каб яе кармілі смачна, але ў той жа час правільна. Мы ўсе вельмі любім свежы хлеб, але для пацыентаў, якія пакутуюць на хваробы жоўцевага пузыра, ён проціпаказаны, есці пажадана ўчарашні. Такім хворым патрабуецца ўжываць вялікую колькасць гародніны. У той жа час харчаванне павінна быць дробнае: з'ядаць за адзін прысест салату з кілаграма памідораў не рэкамендуецца. Трэба выключыць з рацыёну ўсімі намі любімыя тлустыя прадукты: шашлык, смажаныя катлеты. Іх можна падсмажыць, але затым апрацаваць на пары, каб сышоў тлушч. Рэкамендуецца выключыць сметанковае масла, у ім шмат халестэрыну, што і спрыяе ўтварэнню камянёў. Варта знізіць ужыванне яек: даследчыкі прыйшлі да высновы, што аднаго на суткі дастаткова для атрымання бялку, і яно не нанясе шкоды. Калі гатуеце супы, то яны павінны быць не наварарыстыя, а вегетарыянскага кшталту.

Усе мы любім есці перад тэлевізарам — у гасцінай, скурчыўшыся на падлозе над маленькім столікам ці седзячы-лежачы на канапе. Страўнікава-кішэчны тракт гэтага не любіць. Есці лепш за сталом на кухні, прычым у спакойным стане. Пасля прыёму ежы не рэкамендуецца, як казалі нашы бабулі, «ляжаць, каб тлушчык завязаўся». Лепш устаць, пабыць у вертыкальнай паставе, зрабіць нейкія нескладаныя рухі — прыбраць са стала і памыць посуд. Не трэба мучыць свой арганізм: не паспяваю паабедаць, затое паем увечары за ўвесь дзень.

> **«Варта знізіць ужыванне яек: даследчыкі прыйшлі да высновы, што аднаго на суткі дастаткова для атрымання бялку, і яно не нанясе шкоды».**

***— Фізічныя практыкаванні, актыўнасць дапамагаюць пазбавіцца ад застою жоўці?***

— Калі маюцца каменьчыкі, часцей за ўсё адзін з іх трапляе з жоўцевага пузыра ў пратокякраз тады, калі пацыент праедзе на веласіпедзе, дзесьці паскача — пасля ўструсвання. Каменьчыкі ў жоўцевым пузыры — як манеты ў скарбонцы. Калі яны не буйныя, трапляюць у пратокі і перакрываюць іх. Канешне, цалкам пазбягаць фізічных нагрузак не атрымаецца, але з такім захворваннем пажадана адмовіцца ад заняткаў у трэнажорнай зале.

***— Пасля выдалення жоўцевага пузыра камяні ўтварыцца ўжо не могуць?***

— Калі выдалены жоўцевы пузыр, камяням утварацца папросту няма дзе. Але часам сустракаецца так званы постхалецыстэктамічны сіндром, калі пасля аперацыйнага лячэння адзін з дробных каменьчыкаў застаўся ў пратоку. Тады звяртаюцца да паўторнага аперацыйнага лячэння і выдаляюць яго.



Ад прадзедаў

# «Я НАРАДЗІЛАСЯ ЗУСІМ НЕ ТУТ, АЛЕ...»

**Што можа быць раднейшае, чым дом, чым месца, дзе ты з'явіўся на свет і вырас, дзе сустрэў сяброў, прызнаўся ў каханні?.. Так атрымалася, што маёй радзімай з'яўляецца Казахстан. У той краіне мае першыя сябры, школа, настаўнікі... І ў той жа час — адчуванне сваёй... выпадковасці, часам — нават непатрэбнасці. Свой уласны дом я знайшла пазней.**

Беларусь... Для мяне гэта больш, чым назва краіны. Гэта абшары лясоў, дзе жывуць загадкавыя дрыяды; гэта рамонкавыя палі, у якіх я марыла «патануць»; гэта дзівосныя па прыгажосці рэкі і азёры, дзе водзяцца таямнічыя русалкі; гэта загадкавае неба з мноствам адценняў...

Магчыма, я не зусім аб'ектыўная (ды такое яно і ёсць), але ж калі ты нешта ці некага любіш, то не бачыш ужо недахопаў.

Першае, што ўразіла, калі я апынулася тут, у Беларусі, — гэта дрэвы ў лясах: вітаючы мяне, яны зліліся кронамі і падарылі гэтакі водар... Халодны пах моху... Лёгкі «прысмак» маладой травы... Пасля пылу ў стэпавым Казахстане беларускія лясы сталі для мяне чарговым цудам свету!

Другой прыемнай нечаканасцю была, так бы мовіць, «колькасць месцаў для купання»: хуткія гарэзлівыя рачулкі, больш важныя павы-рэкі, сінія мудрыя азёры...

Але ж сустракаюць сапраўды па адзенні. А па-сапраўднаму я палюбіла гэту краіну, калі пазнаёмілася з яе гісторыяй: князі і асветнікі, старадаўнія легенды, паданні... Мяне захапіла ў палон мінулае Беларусі, асабліва — гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, якую я вывучала з асаблівым задавальненнем.

І няхай тады яшчэ шмат чаго не разумела — людзі і падзеі мінулага натхнялі мяне працаваць на будучае, на тое, што па-сапраўднаму баліць.

Я дзіву давалася, калі чула ад новых знаёмых, сяброў, што беларуская мова — гэта «мова вёскі», што яна, маўляў, непрыгожая...

Так, сапраўды, для новага чалавека асобныя словы мо здадуцца такімі, але ці ж трэба гэтыя меркаванні прымаць за ісціну ў апошняй інстанцыі? Да таго ж, будзем шчырыя, мала каму дазводзіцца чуць сапраўдную беларускую мову. Менавіта чуць, а не чытаць на ёй. Большасць людзей, якія думаюць, што гавораць па-беларуску, на самай справе карыстаюцца «трасянкай»... Калі ж пачуеш мову сапраўдную: меладычную, ласкавую, як голас маці, — то, я перакананая, не толькі не пакрыўдзіш яе, — будзеш бараніць.

Мне вельмі шкада, што людзі не задумваюцца аб гэтым, «следуют глупой моде» — адракаюцца ад свайго, ад роднага.

Я вельмі спадзяюся, што не позна яшчэ выратаваць нашу мову, нашу самабытную культуру. Пішу менавіта «нашу», бо проста адчуваю, што гэта маё.

І няхай я нарадзілася не тут, сэрца маё назаўсёды звязана з зямлёй Беларусі, з радзімай маіх бабулі і дзядулі, маіх прадзедаў.

**Вольга Кавальчук,** *г. Мінск.*

Асабістае

# «А ДРЭВЫ ЯГО І СЁННЯ РАСТУЦЬ...»

**«Дзед, а дзед», — клічуць мяне малыя ўнукі (а за імі часам — і дзеці з жонкай)... Я адзываюся, хоць іншы раз і думаю, што неяк ранавата: не адпавядаю пакуль, не дацягваю — найперш маральна — да гэтага высокага «чыну». А вось іншыя...**

Міжволі прыпомніў дзядоў, ведаць якіх стала сапраўдным шчасцем.

Ну вось напрыклад. Жыў у нашай вёсцы дзед Марка. Зімовымі вечарамі ў самасшытым кажуху з вялізным каўнярoм ён прыходзіў у хату да майго сябра Віці і з людзьмі дарослымі, ну, напэўна ж, гаварыў на нейкія сур'ёзныя тэмы. Але як толькі з'яўляліся мы, дзеці, стары адразу пераключаўся на нас: прыязна ўсміхаўся ў доўгія (як у Тараса Шаўчэнкі) сівыя вусы, пра нешта пытаў, а ўрэшце — падступаў да галоўнага: «А ці чулі вы казку...»?

Як жа мы чакалі вось гэтага «ці...»! Як жа рады былі сказаць: «Не!», бо дзед Марка — ён ніколі не паўтараўся! Да таго ж усе казкі ў яго былі чарадзейныя, цікавыя і... бясконцыя. У тым сэнсе, што спыняў ён расказ хіба тады, калі мы з дружбаком пачыналі кляваць насамі...

Дарослыя паблажліва называлі дзеда прыдумшчыкам, а то і балбатуном, але ён не крыўдзіўся, ён прыдумваў і расказваў казкі.

Я люблю іх да сёння. Шкада вось — бракуе часу чытаць. Хіба што некалі дзецям, а цяпер і ўнукам.

...Быў у вёсцы і дзед Міхал. Жыў ён чамусьці адзін — у вялікім доме, у цэнтры, ля крамы. Відаць, па гэтай прычыне па вечарах там любілі «тусавацца» мужчыны (жанчыны — з рукадзеллем — збіраліся асобна. І шкада, што гэтай завядзёнкі цяпер няма — знішчыў тэлевізар)... Рассаджваліся ўздоўж сцен на лавах, курылі самасад, размаўлялі...

Чаму я, малы, можна сказаць, рваўся на гэтыя мужчынскія вячоркі? Мой інтарэс: нехта са старэйшых сказаў, што дзед Міхал вучыўся ў царскай школе, што ён па-ранейшаму захоўвае... падручнікі!

Ад такой навіны ў мяне і «дах паехаў»! Захацелася хоць бы вочкам адным пабачыць, як выглядаюць царскія кніжкі. А можа, гэта плёткі і ніякіх падручнікаў няма?

Сумненні развеяў сам дзед, калі з усёй асцярогай ды павагаю выцягнуў з шафы стос кніг, калі адну з іх перадаў мне: на, маўляў — пачытаеш гэту, можа, потым іншую дам.

Такім чынам у мяне з'явілася магчымасць прыходзіць на мужчынскія вячоркі і заадно, пакуль дзед рабіў «прыём ды выдачу» падручнікаў, паслухаць няспешную цікавую гаворку. Яно ж як было: пра тую рэвалюцыю, грамадзянскую вайну, калектывізацыю і ўвогуле жыццё нам у школе казалі адно, мы слухалі ды пазяхалі, а тут — самі ўдзельнікі падзей, відавочцы...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Каб не дым ад самасаду, які да болю рэзаў і вочы, і горла, далібог зашыўся б тады недзе за печчу і слухаў, слухаў, слухаў!

...Дача ў мяне з'явілася, калі было за трыццаць. Хацелася паставіць нейкі дамок. Хацелася, каб на «сотках» хоць нешта вырасла. Таму я пайшоў па вёсцы, каб прапытаць у некага гною і такім чынам пазнаёміўся з яшчэ адным цудоўным дзедам. Ён (і таксама, здаецца, Міхал) завёў мяне ў «святая святых» — у свой абгароджаны плотам садок...

Пра Мічурына я тады, вядома ж, чуў ды нешта чытаў, а тут наяве ўбачыў вучонага-самавука з досыць вялікай доследнай гаспадаркай.

Добрую гадзіну ён вадзіў мяне ад дрэва да дрэва, з гонарам паказваў свае напрацоўкі.

Мне як дачніку-пачаткоўцу яны і праўда былі цікавыя... Дзед жа, «падкуплены» гэтай рэдкай увагай, раптам расшчодрыўся і падарыў мне два саджанцы: яблыньку і грушу, прывітыя на дзічках.

Трыццаць гадоў маёй дачы, дзеда таго даўно няма, а дрэвы яго і сёння растуць ды радуюць сваімі пладамі.

...І напаследак — пра дзеда-музыку. Неяк давялося нам з прыяцелем начаваць у незнаёмай вёсцы. У час вячэры са шчырай размовай высветлілася, што гаспадар служыў у польскай арміі, потым ваяваў у Савецкай, з вайны вярнуўся параненым, але ж галоўнае, што жывы і з... акардэонам.

Мы папрасілі яго сыграць. Дзед згадзіўся. І...

Праўду сказаў герой кінакамедыі: душы ў нас разгарнуліся і назад не згарнуліся, бо іграў дзед проста цудоўна! Спяваў таксама і вядомыя песні, і... уласныя, прычым — на чатырох мовах: беларускай, рускай, польскай ды ўкраінскай.

Вось такіх дзядоў я назваў бы сапраўднымі.

А родных, на жаль, ніколі не бачыў: дзядуля Архіп ваяваў у Першую сусветную, дамоў вярнуўся з «Георгіем», ад шалёнай кулі загінуў увосень 39-га, дзед Мікалай — у сакавіку 45-га каля возера Балатон...

Прадзед яшчэ быў — Антон. Казалі, што ён, шкадуючы скаціну, здаралася, сам станавіўся ў аглоблі — зрушваў з месца воз, а ўжо потым запрагаў валоў.

Вось цяпер, здаецца, расказаў пра ўсіх.

**Іван Гаральчук,** *г. Мінск.*

Пасля пісьма

# ШТО ВЫГАДНЕЙ — выпускаць самім ці купляць за мяжой?

**«Нехта, магчыма, палічыць, што ўздымаю дробязныя пытанні, але ж, на маю думку, яны вельмі важныя. Шэсць гадоў я жыву з ЭКС, — піcаў спадар Т. з Іўя, — з дзяцінства пасля перанесенай траўмы маю праблемы са слыхам, дзесяцігоддзямі пакутую ад варыкознага расшырэння вен... Чым ратуюся? Першы апарат вырабляецца ў ЗША і Канадзе, другі — у Даніі і Швейцарыі, эластычныя панчохі таксама замежныя. Узнікае заканамернае пытанне: чаму наша дзяржава не можа наладзіць падобную вытворчасць? Чаму хворыя павінны выкладваць досыць значныя сумы за імпарт?»**

Як патлумачыла **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама спадарыня Наталля АНТАНОВІЧ,** Праграма імпартазамяшчэння ў Беларусі працягваецца не першы год. За апошнія пяць гадоў у краіне асвоена вытворчасць больш чым 280 найменняў тавараў, у іх ліку гіпаалергенныя дзіцячыя сухія сумесі, падгузкі для дзяцей, супрацьвірусны прэпарат «Арпетол» і іншае.

У прыватнасці, кампанія «Белпа-мед», беларускі вытворца вырабаў медыцынскага прызначэння, у канцы лета 2017 года асвоіла выпуск новай лінейкі прадукцыі — кампрэсійнага трыкатажу «Карысць». Сёння асартыментны пералік кампаніі ўключае больш за сто адзінак, сярод якіх вырабы для пазваночніка і суставаў, бандажы для цяжарных, пасляаперацыйныя вырабы і г. д.

Аднак цалкам замяшчаць імпарт сэнсу не мае, бо ў некаторых кірунках спробы «дагнаць і перагнаць» сусветных лідараў нерацыянальныя. Шэраг тавараў медыцынскага прызначэння не вырабляецца ў Рэспубліцы Беларусь, бо іх замяшчэнне эканамічна нявыгадна або з аб'ектыўных прычын немагчыма. У прыватнасці, штогадовая патрэба ў закупцы такіх складаных вырабаў, як ЭКС або слыхавыя апараты, невысокая (для Гродзенскай вобласці ў 2018 годзе яна склала адпаведна каля 300 і 600 адзінак), што нельга супаставіць з выдаткамі на стварэнне іх уласнай вытворчасці.

А таму — пытанне ў лісце ўзнята слушнае. Адказ, здаецца, вычарпальны.

Чалавек сярод людзей

# Вінен? Аддаць павінен

**«Ну і доўгія ж летнія дні ў чалавека, які нічога не робіць, — скардзіцца наша доўгажыхарка Ядвіга Іосіфаўна Рудзянкова. І тут жа ўдакладняе, што работы, маўляў, навалам, вочы бачаць яе, а вось сіл даўно няма — растрачаны за 90 (з лішкам!) гадоў жыцця. Прычым вельмі нялёгкага!**

У шматдзетнай сям'і Урбановічаў Ядзя нарадзілася другой, і дзяцінства яе, як многіх, абарвала вайна. Ужо ў канцы яе, пры вызваленні Польшчы, здарылася непапраўнае — загінуў бацька. А таму разам з маці старэйшыя дзеці «запрагаліся» ў плуг, цягалі барану, касілі, насілі, пасвілі скаціну...

Не ад добрага жыцця ў 18 гадоў Ядзя выйшла замуж. Ды з агню, як той казаў, у полымя: піў яе гаспадар, на маладую жонку не раз падымаў руку. Вось і не вытрымала: з Магілёва пехатой прыйшла дамоў у роднае Восава. Уладкавалася на работу на торфараспрацоўкі. А калі ад гумовых ботаў сталі балець ногі, занялася сваёй гаспадаркай, прадавала ў горадзе калі масла, калі малако...

Якраз на базары і ўбачыла яе адна з найлепшых бярэзінскіх доктарак (светлай памяці!) Варвара Іванаўна Кулікоўская — пагаварыла, запрасіла да сябе ў домработніцы. Для Ядзі гэта была не проста праца, але і вялікі гонар, а яшчэ — цудоўная магчымасць убачыць іншыя адносіны ў сям'і, іншыя парадкі.

Нават больш за тое — у хуткім часе па суседстве з Кулікоўскімі пасяліліся сем'і Зямлянскіх, Навумавых, Шніткoвых, Хрысціянавых, Рудзянковых... Уцякаючы ад голаду ва Украіне, яны пераехалі ў Беларусь, у Беразіно. І, вядома ж, зусім не дзіва, што высокая, статная Ядзя спадабалася Пятру Рудзянкову...

Ці мог спадабацца ён, інвалід? Былі ў хлопца сумненні, але ж... «Найгоршыя хваробы — п'янства ды гультайства, — кажа цяпер Ядвіга Іосіфаўна. — А што мой з адной рукою быў ды з адным вокам — яшчэ не бяда. Пасля вайны і не такія калекі вярталіся. Пётра, дзякаваць богу, здаровы быў...»

Праз пяць гадоў яны пабудавалі дом і сталі гадаваць двух дачушак — Ірыну і Наталлю, так што цяпер... «Жыву — як у Бога за пазухай», — усміхаецца доўгажыхарка.

І сапраўды: утульны дом, дагледжаны ўчастак, мора кветак... Але ж для дачкі Наталлі, у мінулым настаўніцы і загадчыцы дзіцячага сада, клопат пра матулю — гэта найпершае.

**Ніна Бурко,** *в. Капланцы, Бярэзінскі раён.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Памяць

# ЯШЧЭ РАЗ ПРА ВАЙНУ

**Да гадавін перамогі нашага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў, да юбілейных дат у Беларусі выдаюцца і перавыдаюцца ёмістыя кнігі, калектыўныя зборнікі, мемуары нашых празаікаў, паэтаў, гісторыкаў аб той чалавечай трагедыі.**




Брэсцкія пісьменнікі таксама далучаюцца да гэтай патрэбнай і важнай творчай працы, прымаюць актыўны ўдзел у зборы інфармацыі аб тых страшных ваенных падзеях на шматпакутнай зямлі роднай Брэстчыны. Пажаўцелыя дакументы франтавікоў і партызан, дзённікі камандзіраў, пісьмы-трохвугольнікі, паштоўкі, паведамленні і... «пахаронкі» з фронту, вестачкі з тылу, успаміны жывых сведкаў ваенных падзей служаць асновай для напісання новых твораў, прысвечаных подзвігу і гераізму нашых бацькоў, дзядоў, прадзедаў.

Адным з такіх шчырых і адданых патрыётаў-літаратараў і стваральнікаў кнігі-помніка мужнаму пакаленню пераможцаў з'яўляецца сябра Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Валковіч.

Сёлета пабачыла свет дапоўненае і перапрацаванае другое выданне яго твора — унікальнага гістарычна-дакументальнага, публіцыстычнага, ілюстраванага зборніка «Пісьмы вайны» (Брэст, «Альтэрнатыва», 2019). Першае выданне выйшла ў 2010 годзе з ініцыятывы аўтара кнігі і абласной газеты «Заря» пры падтрымцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама. Дапоўненае і дапрацаванае выданне прысвечана 75-годдзю вызвалення Брэсцкага раёна, таму яго актыўна падтрымаў Брэсцкі раённы выканаўчы камітэт.

Змястоўную прадмову да зборніка напісаў сам пісьменнік. Атрымалася яна ў яго па-сапраўднаму патрыятычная, а самае галоўнае — да болю ўражальная і кранальная, як быццам сам пісьменнік прайшоў па тых вогненных дарогах праз пекла вайны. Ці не таму, што пра жахі вайны празаік наслухаўся яшчэ з дзяцінства — ад уласных бацькоў, шматлікіх родзічаў? Бацька пісьменніка, Валковіч Міхаіл Ільіч, — удзельнік вайны, ардэнаносец; маці, Лідзія Іларыёнаўна, два гады адбатрачыла ў нямецкіх працоўных лагерах. Таму чытаць аўтарскую прадмову раўнадушна, без слёз немагчыма.

Патрэба ў перавыданні кнігі, як тлумачыць сам аўтар, узнікла таму, што далёка не ўсё сабранае раней змагло трапіць у першае выданне (з-за аб'ёму рукапісу, друкарскіх затрат), а тут яшчэ дадалася і новая важная інфармацыя: пашчасціла сабраць шмат дадатковага ваенна-дакументальнага, эпісталярнага, ваенна-гістарычнага матэрыялу. Адазваліся ажно з Падмаскоўя сваякі лейтэнанта Айзіка Іофе — абаронцы легендарнай Брэсцкай цытадэлі, імя якога навечна выбіта на плітах Мемарыяла крэпасці-героя...

Увага і гэтым разам больш аддавалася ваенным гісторыям і лёсам воінаў-змагароў, публікацыі іх простых, але шчырых і цёплых пасланняў родным людзям. Ва ўсіх пажаўцелых ад часу, зачытаных, працёртых агрубелымі рукамі лістах яскрава прысутнічае сапраўды вялікая любоў да Айчыны і цвёрдая вера ў Перамогу.

Геаграфія франтавой карэспандэнцыі і дакументаў, уключаных у зборнік, даволі шырокая. Разнастайнасць архіўных, музейных матэрыялаў падзелена на раздзелы і главы і размеркавана ў храналагічным парадку з 1941—1945 года. Выключэнне было зроблена толькі для матэрыялаў, звязаных з вызваленнем Беларусі і Брэстчыны, што само па сабе апраўдана. Бо вайна, як піша Валковіч, «не дазіравала смярцей і страт, а адпускала кожнаму рэгіёну і чалавеку спаўна». Асаблівая ўвага ў кнізе аддаецца пісьмам нашых землякоў-партызан, удзельнікам знакамітай вызваленчай аперацыі «Баграціён».

Тэкст зборніка падзелены на шэсць глаў. У першую ўключаны малавядомыя адсканаваныя пісьмы абаронцаў Брэсцкай крэпасці — вестачкі на радзіму, напісаныя ў апошнія мірныя дні. Асобнымі главамі прадстаўлены гісторыя дзённікаў, запісных кніжак і сшыткаў-нататнікаў пісьменніка-патрыёта Сяргея Смірнова, партызанскія дзённікі і малюнкі, пісьмы з няволі маладых вязняў-беларусаў, вывезеных у Германію на прымусовую працу. Дарэчы, па завяшчанні Сяргея Сяргеевіча амаль увесь пісьменніцкі архіў пасля яго смерці быў перавезены ў Музей абароны Брэсцкай крэпасці, дзе і Аляксандр Валковіч як дакументаліст знайшоў нямала карыснай інфармацыі.

У кнізе адзначаны ўсе раёны Брэсцкай вобласці — лістамі-пасланнямі франтавікоў з ліку ўраджэнцаў кожнай мясціны, іх баявых сяброў, маці, жонак, нашчадкаў. Вялікай падборкай прадстаўлены Піншчына, Століншчына, адкуль дзясяткі тысяч маладых людзей і непаўналетніх былі прымусова вывезены ў германскае рабства. Пра нечалавечае стаўленне немцаў да нявольнікаў сведчаць уцалелыя дакументы і акты, пісьмы былых вязняў. Дарэчы, арыгіналы гэтых дакументаў пісьменнік адшукаў у Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці, у адкрытым друку яны прадстаўлены ўпершыню.

Горка чытаць пра трагічны лёс выхаванцаў дзіцячага дома пасёлка Дамачава Брэсцкага раёна, знішчэнне якіх адбылося 23 верасня 1942 года, а таксама аповед уратаванай выхаванкі гэтага ж дзіцячага прытулку — полькі Люцыны Хлюдзінскай, якую праз шмат гадоў адшукаў аўтар кнігі...

Са смуткам і абурэннем чытаеш крывавыя падзеі 18 верасня 1942 года: за адзін толькі дзень акупанты расстралялі 2700 мірных жыхароў пасёлка. Такім жа чынам карнікі расправіліся і з вязнямі гета пасёлка Тамашоўка.

Ад болю замірае сэрца, калі чытаеш перадсмяротную запіску мужнай беларускай дзяўчынкі Каці Сусанінай з горада Лёзна Віцебскай вобласці — даведзеная да адчаю, у дзень свайго 15-годдзя (12 сакавіка 1943 г.) яна рашылася на самагубства, каб толькі не ехаць у праклятую Германію.

Родную матулю пісьменніка таксама не абмінула цяжкая доля рабскай працы на чужыне. Лідзія Валковіч была вывезена ў Германію ў жніўні 1943 года, прайшла праз працоўныя лагеры Германіі, Аўстрыі, Італіі і толькі летам 1945 года была вызвалена амерыканцамі. Яе ўласныя ўспаміны пра фізічныя пакуты і душэўныя мукі падчас блукання па еўрапейскіх лагерах сын дазволіў сабе размясціць толькі ў прыканцы зборніка, у 6-й главе.

Аўтар наўмысна і свядома суправадзіў свой праект характэрным падзагалоўкам «Хрестоматия патриотизма», бо лісты, якія былі ўключаны ў кнігу, і ёсць не прыдуманая, а праўдзівая, дакладная летапіс-хрэстаматыя ваеннага часу.

Але як бы старанна і падрабязна я ні апісвала змест зборніка, а ўсё ж такі чытачу, каб лепей зразумець і адчуць той час і людское гора, трэба прачытаць кнігу асабіста — уважліва, удумліва і пранікнёна, бо яна вартая гэтага.

**Надзея ПАРЧУК,**
**сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

**Сродкі на перавыданне збіралі, як кажуць, усім светам. У гэтай справе прынялі ўдзел Саветы ветэранаў, арганізацыі, установы, сельгаспрадпрыемствы і асобныя грамадзяне нашай краіны, а таксама Расіі, Украіны, Германіі, Ізраіля, ЗША. Спрацавалі таксама магчымасці беларускай краўдфандынгавай інтэрнэт-пляцоўкі Ulej.by.**

Спадчына

# Як Паўліна Манюшка ехала па крухмале і цукры

На поўдні Смалявіцкага раёна знаходзіцца аграгарадок Алесіна з аднайменнай вёскай. Тут, у былых памесцях Ваньковічаў, пабываў карэспандэнт «Звязды».

У сярэдзіне XIX стагоддзя ў невялікай сядзібе жыла ўнучка вядомага кампазітара Станіслава Манюшкі — Паўліна і яе сястра Эрнесціна. Калі Паўліне Манюшцы споўнілася пяць гадоў, памёр яе бацька. Таму справы па спадчыне, якая ёй дасталася, вёў на той час старшыня Мінскай палаты грамадзянскага суда Яўстах Прушынскі. Да яе паўналецця багацце памножылася ў разы, бо ўпраўляючыя, якіх ён наняў, умела распараджаліся маёмасцю. Магчыма, менавіта Прушынскі пазнаёміў нявесту з будучым мужам — Леанам Ваньковічам, які таксама меў дачыненне да судовай сістэмы Мінскай губерні. Падчас вяселля нявеста вельмі хацела праехаць на санях. Таму дарогу ад Алесіна да Шыпян — сядзібы жаніха — пасыпалі крухмалам і цукрам — яны нібыта вырабляліся на мясцовым заводзе. Пасля мясцовыя жыхары збіралі каштоўныя прадукты і выкарыстоўвалі іх на свае патрэбы.


Алесіна.
fotobel.by

Але, як сцвярджаюць гісторыкі, гэта ўсяго толькі легенда, бо на той час такой вытворчасці ні ў Алесіне, ні ў Шыпянах не было.

Шмат для ўладкавання памесцяў зрабіў сам Ваньковіч — на той час адзін з самых паспяховых землеўладальнікаў, які з 1878 года засядаў у Мінскім сельскагаспадарчым таварыстве, атрымаўчын праўдзейнага стацкага саветніка і, відома, меў магчымасці і сродкі для развіцця памесцяў. У 1896 годзе ён пабудаваў у Алесіне бровар. Насупраць яго выкапаў два штучныя тэхнічныя вадаёмы. Асабліва імклівыя прамысловыя пераўтварэнні памесцяў Ваньковічаў пачаліся ў канцы XIX стагоддзя. У фальварку Дубрава было ўзведзена некалькі каменных будынкаў — па ўсёй верагоднасці, склады, дзе назапашвалася сыравіна з наступнай яе дастаўкай на іншыя заводы для перапрацоўкі.

У 1903 годзе сышла ў іншы свет Паўліна Ваньковіч. Пасля смерці Леана і Паўліны ўладанні перайшлі да трох іх сыноў.

Пасля прыходу бальшавікоў Алесіна было перайменавана ў сельскагаспадарчую арцель «Новае жыццё», затым — аднайменны калгас. Пасля вайны старую назву вёсцы ўсё ж такі вярнулі. Другое жыццё ў 1990-х комплексу будынкаў надаў тагачасны старшыня калгаса «Шыпяны» Фёдар Прывалаў, цяперашні дырэктар рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі па земляробстве». У іх Фёдар Іванавіч размясціў праўленне калгаса, а цяпер тут знаходзіцца адміністрацыя РУП «Шыпяны-АСК». Будынкі адрамантаваны, тэрыторыя вакол добраўпарадкаваная. У здавальняючым стане і канюшня. Але парк, які знаходзіцца побач з гэтай прыгажосцю, мае не надта дагледжаны выгляд. Зрэшты, ад калісьці шыкоўнага парку з алеямі застаўся невялікі лапік, на якім яшчэ можна прыкмеціць падмуркі былых пабудоў. У 2010 годзе пры ўзвядзенні зернесушыльнага комплексу палову дрэў спілавалі. З другога боку пастаўлены жывёлагадоўчы комплекс.

З Алесіна дарога прывяла нас у памесце Шыпяны, куды Ваньковічы прыязджалі раз-пораз. На ўскрайку вёскі — двухпавярховы будынак з чырвонай цэглы на высокім падмурку з часанымі камянямі, з высокай агародкай і варотамі. На сцяне — відэакамера. Мясцовыя жыхары расказалі, што гэты будынак выкупіў ці ўзяў у арэнду прадпрымальнік.

Непадалёк раскінуўся стары парк, які быў закладзены на мяжы XIX—XX стагоддзяў. Тут захаваўся ў даволі нядрэнным выглядзе дом упраўляючага. На думку іншых, гэта сыраварня, дзе захоўваліся прыпасы. Сам жылы дом знаходзіцца ў вёсцы. Велізарных памераў, ён пабудаваны ў 1900 годзе. Цяпер памяшканне пустуе.

На сённяшні дзень усе гэтыя дыхтоўныя пабудовы стаяць закінутыя, многія разбураюцца. З цягам часу яны ўсё больш будуць прыходзіць у заняпад, пакуль не зруйнуюцца дашчэнту. Не знаходзіцца гаспадар, каб захаваць такую раскошу нашчадкам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Экалогія

# «УЗРОСТ» РАДЫЕАКТЫЎНАСЦІ НА ЗЯМЛІ — 4,5 МІЛЬЯРДА ГАДОЎ

## Атамная электрастанцыя ў «разрэзе» экалогіі і энергетыкі

**За час развіцця атамнай энергетыкі і ядзерных тэхналогій на планеце ўтварылася больш за 1 мільярд кубаметраў радыеактыўных адходаў. Аднак, па словах экспертаў, гэта несупастаўна мала ў параўнанні з аб'ёмамі адходаў прамысловых аб'ектаў увогуле, асабліва хімічнай галіны. Экологі, якія сабраліся ў Мінску на навуковай канферэнцыі «Сахараўскія чытанні 2019 года: экалагічныя праблемы XXI стагоддзя», упэўнены, што калі выбіраць паміж эканамічнай выгадай ад атамнай энергетыкі і экалагічнай бяспекай, то важнасць першай значна перавышае рызыку ад другой. А атамная генерацыя неўзабаве ўвогуле можа стаць сапраўднымі «лёгкімі планеты». Адзіны мінус пры гэтым — чалавецтва толькі вучыцца выкарыстоўваць адпрацаванае на АЭС паліва. Пакуль мы можам толькі захоўваць яго і перапрацоўваць, намагаючыся пры гэтым максімальна паменшыць колькасць небяспечнага матэрыялу.**


Ахмед ДЭМІРАК.

### РАДЫЕНУКЛІДЫ АТАМНЫЯ І ПРЫРОДНЫЯ

У свеце дзейнічае больш за 230 атамных электрастанцый, будуецца яшчэ 37. Сучасная Беларуская АЭС у параўнанні са станцыямі, што існавалі раней, будзе выпрацоўваць значна менш адходаў падчас работы, аднак поўнасцю пазбавіцца ад іх не атрымаецца, лічыць **Алег МУРАТАЎ, прафесар, член грамадскага савета Дзяржкарпарацыі «Расатам», член Акадэміі навук экалогіі, бяспекі чалавека і прыроды (Санкт-Пецярбург, Расія):**

— Ва ўсіх краінах з ядзернай энергетыкай цяпер распрацоўваюцца метады і тэхналогіі для бяспечнага захоўвання і перапрацоўкі ядзерных адходаў. У свеце існуе больш за 12 міжнародных праграм па скарачэнні вадкіх паліўных адходаў. Напрыклад, тэхналогія па іх зацвярдзенні. Створаны падземныя даследчыя лабараторыі па бяспечным захаванні ў Германіі, Іспаніі, Бельгіі, Швецыі, Фінляндыі, Злучаных Штатах і іншых краінах. Асноўныя адходы, якія будуць ствараецца на АЭС у Астраўцы, — адходы нізкай актыўнасці: спецадзенне, інструменты, тара з-пад матэрыялаў. Распрацавана методыка па іх утылізацыі. Гаручыя матэрыялы спальваюць (радыеактыўны попел займае ў 80—100 разоў менш месца). Тое, што прасуецца, сціскаюць.

Важна памятаць, што радыяцыйныя матэрыялы ўтвараюцца не толькі праз развіццё АЭС. Радыеактыўныя і многія прыродныя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца ў энергетыцы і іншых галінах: вугаль, нафта, газ, гаручыя сланцы, жалезная руда. А гэта значыць, што радыеактыўнасць была на Зямлі заўжды, з моманту яе фарміравання — каля 4,5 мільярда гадоў таму.

— Праблема ў тым, што часта блытаюць паняцці «адпрацаванае ядзернае паліва» і «радыеактыўныя адходы, — працягвае прафесар. — Апошнія — гэта матэрыял, далейшае выкарыстанне якога не прадугледжана. А вось адпрацаванае ядзернае паліва, апраменянае ў рэактары, можна разглядаць як сыравіну, у якой утрымліваецца каля 300 разнастайных ізатопаў, многія з якіх каштоўныя для вывучэння і для шматлікіх галін прамысловасці. Дзякуючы гама-выпраменьванням можна даследаваць якасць металу, а ізатопы — выкарыстоўваць як кардыястымулятар. І вядучыя ядзерныя краіны займаюцца якраз не захаваннем паліва, а яго перапрацоўкай. Адзіны яе недахоп — дадатковае ўтварэнне радыеактыўных адходаў.

### АЭС У ТУРЦЫІ. 60 ГАДОЎ ДАМОЎЛЕНАСЦЯЎ

Турцыя ўваходзіць у дваццатку краін з найбуйнейшымі эканомікамі свету, таму робіць вялікія ўкладанні ў ахову навакольнага асяроддзя. Аднак пры гэтым на яе тэрыторыі не існуе ніводнай атамнай станцыі. Першая АЭС у краіне толькі будуецца і, як мяркуецца, будзе запушчана ў 2023 годзе, расказаў **Ахмед ДЭМІРАК, эколаг, прафесар Універсітэта горада Мугла (Турцыя).**

Пры гэтым у краіне з разуменнем ставяцца да глабальнага пытання аховы навакольнага асяроддзя. Большасць няўрадавых арганізацый Турцыі — аб'яднанні, якія думаюць пра экалагічную будучыню і асяродак і займаюцца экалагічнай асветай. Дысцыпліны па ахове навакольнага асяроддзя выкладаюцца больш чым у 200 вышэйшых навучальных установах.

— Адказнасць, адукацыя і ўменне дамаўляцца — тры галоўныя складнікі ў рашэнні экалагічных задач, якія стаяць перад чалавецтвам. Мы павінны несці адказнасць за тое, што робім, і мець адпаведную экалагічную адукацыю, каб людзі, якія ўзялі на сябе клопат пра экалогію і разумеюць гэтую праблему, выхоўвалі новае пакаленне. А энергетычныя кампаніі павінны не толькі забяспечваць экалагічна чыстую, устойлівую энергетыку, але і падтрымліваць ініцыятывы па ахове асяродка. Трэба памятаць, што прырода можа стаць ахвярай чалавечай дзейнасці. Калі я вучыўся на аддзяленні хіміі ў 90-я гады мінулага стагоддзя, не было ніводнага прадмета, які датычыўся б аховы навакольнага асяроддзя. Аднак цяпер, з'яўляючыся прафесарам хіміі на гэтым жа факультэце, асабіста я чытаю тры курсы, якія маюць дачыненне да тэмы аховы асяроддзя, — кажа Ахмед Дэмірак. Карыстаючыся момантам, карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з ім пра тое, як адбываўся падрыхтоўка да будаўніцтва АЭС у Турцыі.

***— Параўнайце, калі ласка, карысць і рызыку ад стварэння атамнай электрастанцыі ў краіне?***

— Турцыі неабходны доступ да энергіі, каб не залежаць ад знешніх пастаўшчыкоў энерганосьбітаў. Для нашай эканомікі гэта карыснае рашэнне, бо 7,7 % патрэб краіны ў энергіі можна будзе пакрываць за кошт той, што будзе выпрацоўвацца на АЭС. А работа па абгрунтаванні неабходнасці АЭС у Турцыі ўвогуле і па падрыхтоўцы неабходнай для будаўніцтва базы вядзецца ўжо 60 гадоў. Так што гэта не спантаннае рашэнне, а вынік дэталёвай прапрацоўкі магчымых варыянтаў і пляцовак для ўзвядзення.

Безумоўна, існуе пэўная рызыка ад стварэння АЭС, аднак яна звязана з тым, як будуць нейтралізаваны адходы пасля завяршэння жыццёвага цыкла станцыі.

***— Здаецца, 7,7 — працэнт не надта значны, няўжо такога паказчыка дастаткова, каб ствараць у краіне атамную энергетыку? Ці не хапае альтэрнатыўных відаў энергіі?***

— Турцыя валодае двума рэсурсамі, якімі яна можа скарыстацца для росту ўласнай эканомікі. Гэта гідра- і цеплаэлектрастанцыі, якія працуюць на вуглі, аднак абодва варыянты досыць затратныя для атрымання энергіі. А з дапамогай аднаўляльнай энергіі сонца і ветру, як сведчаць разлікі, мы зможам забяспечыць вельмі невялікую частку патрэб краіны, хоць затраты на развіццё падобнай энергетыкі досыць сур'ёзныя. Турцыі неабходна валодаць атамнымі тэхналогіямі, аднак пры гэтым трэба дакладна размяжоўваць паняцці «атамнай тэхналогіі» і «ядзернай зброі». Мы за адсутнасць зброі і за мірны атам.

***— Як удалося дасягнуць грамадскага прыняцця будаўніцтва АЭС і наладзіць дыялог з людзьмі, каб яны паверылі ў бяспеку і карысць атама?***

— У грамадскай свядомасці пакуль не забытая чарнобыльская трагедыя і здарэнні на Фукусіме, дзе працягваецца пэўная эмісія і актыўнасць. Гэтыя фактары засталіся ў сацыяльнай памяці і ўзрушаюць свядомасць людзей, нараджаюць адчуванне рызыкі.

Згодна з вынікамі анкетавання 2012 года, якое мы праводзілі ў Турцыі, 63 % насельніцтва выказалася супраць будаўніцтва АЭС. Аднак гэта было абумоўлена не пратэстам супраць рэальнага ўздзеяння станцыі на наваколле, а разуменнем высокай рызыкавай нагрузкі гэтага праекта. Астатнія 37 % адказалі, што падтрымліваюць атамную энергетыку, бо краіна ў сваім эканамічным развіцці мае патрэбу ў энергіі. Дарэчы, у такіх жа прапорцыях галасы рэспандэнтаў падзяліліся і пры выказванні свайго стаўлення да будаўніцтва гідраэлектрастанцыі, якое так ці інакш робіць шкоду пэўнаму рэгіёну і ўплывае на яго экалагічную абстаноўку.

Што датычыцца сённяшняй дасведчанасці турэцкага насельніцтва, то абсалютная большасць цяпер разумее, што калі АЭС будзе збудавана надзейным падрадчыкам, то ніякіх пытанняў па яе дзейнасці не ўзнікне. Дарэчы, атамную станцыю ў нас будуе кампанія «Расатам» — тая ж арганізацыя, якая адказвае за ўзвядзенне Беларускай АЭС і вядомая сваімі атамнымі праектамі ва ўсім свеце.

***— Што вы як эколаг можаце параіць для пераадолення радыефобіі, што з'явілася ў насельніцтва Беларусі пасля аварыі на ЧАЭС?***

— Адкажу як жыхар чарнаморскага ўзбярэжжа Турцыі, дзе я вырас. Гэта мясціны, дзе расце чай, — менавіта тут пасля чарнобыльскай аварыі існаваў найбольшы ў краіне ўзровень забруджанасці, зафіксаваны рост анкалагічных захворванняў. Калі я вырас і стаў прафесарам, звярнуўся ў турэцкае ведамства па атамнай энергетыцы, каб даведацца, ці праўда, што рост анкахвароб быў звязаны з аварыяй. Калі казаць аб'ектыўна, то нейкі працэнт хвароб можна сапраўды спісаць на чарнобыльскую трагедыю. Аднак асноўны рост анкалагічна хворых на ўзбярэжжы тлумачыцца выкарыстаннем угнаенняў, асабліва нітратаў, у вытворчасці чаю і фундука. Так што народная пагалоска значна перабольшыла ў той час рэальную карціну.

Правільнае інфармаванне і асвета прынасяць вынік. Цяпер фобіі значна меншыя, чым раней. У большасці людзей страх пераадолены, і яны падтрымліваюць атамную галіну энергетыкі, бо разумеюць, што эканоміка краіны мае ў ёй патрэбу. Страх, навеяны здарэннем на ЧАЭС, — тое, што агульнымі намаганнямі была перабольшана ў маштабах з дапамогай у тым ліку і СМІ. Тым не менш сучасныя АЭС будуюцца па тэхналогіях, якія загадзя мінімізуюць магчымыя рызыкі, таму падстаў для хваляванняў няма.

**Ірына СІДАРОК.**

---

Здарэнне

## Дзеці падпалілі... поле пшаніцы

**У Дзяржынскім раёне ад дзіцячага свавольства ледзь не згарэла пшанічнае поле, паведамляе УУС Мінскага аблвыканкама. Агонь пашкодзіў каля 0,3 гектара пасеваў.**

Пра гэты пажар ратавальнікам паведаміў устрывожаны дзіцячы голас. Супрацоўнікам міліцыі ўдалося ўстанавіць падпальшчыкаў. Імі былі мясцовыя хлопчыкі і дзяўчынкі 10—13 гадоў. Аглядаючы месца здарэння, праваахоўнікі выявілі непадалёк моцна абкурадымленую дзіцячую байку і хлопчыка, які хаваўся ў кустах. Ён расказаў, што прыбег паглядзець, ці патушылі пажар.

Было ўстаноўлена, што тры хлопчыкі і тры дзяўчынкі 10—13 гадоў, якія жывуць на ўскрайку Дзяржынска, пайшлі ў імправізаваны паход. З сабой ўзялі ежу, запалкі, запальнічку і цыгарэты. Каля пшанічнага поля вырашылі спыніцца і паесці. Пасля хлопчыкі пакурылі. Затым адзін сарваў некалькі сцёблаў пшаніцы, вынес на дарогу і падпаліў, а запалку адкінуў убок. Трава і высахлыя сцёблы пачалі займацца полымем.

Дзеці затапталі агонь. Аднак адзін з хлапчукоў вырашыў падпаліць пшаніцу на корані. Хлопцы хацелі даць полымю трохі пагарэць, а потым зноў яго затаптаць. Але тое разгарэлася занадта. Хлопцы спрабавалі тушыць агонь падручнымі сродкамі: заплечнікам, байкай і рэшткамі вады з бутэлькі...

Вынік свавольства — згарэлыя 0,3 гектара пшаніцы. Страта, панесеная ААТ «Крутагор'е-Петкавічы», ацэнена ў Br6,5 тыс. Яе давядзецца кампенсаваць бацькам падлеткаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

---

Ну і ну!

## Скралі з градкі 80 кг цыбулі

**Пацярпела сямейная пара пенсіянераў з Вілейкі.**

Здарэнне адбылося на Лугавым завулку. Ноччу з прыватнага падворка невядомыя зламыснікі выкралі проста з градкі 80 кілаграмаў гэтай гароднiны.

Як паведамляе сайт УУС Мінаблвыканкама, гаспадары скрадзенага — пенсіянеры, якія вядуць сваю хатнюю гаспадарку. Градка ў іх была даволі доўгая, прыблізна 40 метраў. У праваахоўнікаў ёсць здагадка, што вырываў цыбулю не адзін чалавек, бо аб'ём надта вялікі.

Цяпер асобы зламыснікаў высвятляюцца, а таксама падлічваецца прычыненая шкода.

## Мужчыну параніла ў шыю стралой

**Здарэнне адбылося пад Астраўцом. Інфармацыя пра гэта размешчана на Telegram-канале Следчага камітэта Беларусі.**

Астравецкім раённым аддзелам СК прынята да выканання крымінальная справа, заведзеная пракуратурай па факце прычынення цяжкіх цялесных пашкоджанняў па неасцярожнасці. Вядома, што ўвечары ў лесе побач з Астраўцом падчас стральбы па мішэні з лука быў паранены 41-гадовы мужчына. Страла трапіла яму ў шыю. Пацярпелага даставілі ў бальніцу. У здзяйсненні злачынства падазраецца яго 23-гадовы знаёмы. Малады чалавек затрыманы. Для выяўлення ўсіх абставін агледжана месца здарэння, дапытваюцца відавочцы, прызначана судова-медыцынская экспертыза. Стралковыя характарыстыкі лука і высновы аб яго прыналежнасці да катэгорыі кідальнай зброі будуць таксама ўстаноўлены падчас экспертызы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# БУГУРТЫ, КОННАЕ МІЛЕ І ФАЕР-ШОУ

## Чым здзіўляў Рыцарскі фэст «Мсціслаў-2019»

**Горад з больш чым тысячагадовай гісторыяй у 12-ы раз акунуўся ў Сярэднявечча. Вуліцы Мсціслава запоўнілі рыцары, красуні ды менестрэлі. Два дні не спыняліся турніры коннікаў ды лучнікаў, якія паказвалі свой спрыт. Сярэднявечныя напоі — квас, віно, збіцень ды гарбата — наталялі смагу, а падарожжа на раскоп старажытнага гарадзішча, аглядную вежу і нават на выстаўку прылад сярэднявечных катаванняў — насычала самыя розныя густы.**

### БОГ, ГОНАР, АЙЧЫНА

Мсціслаўшчына багатая на вялікія падзеі і людзей, якія іх здзяйснялі і якімі ганарацца не толькі мсціслаўцы, а і ўся краіна. Сам вялікі князь Мсціслаўскі Сямён Лугвен, які падчас Грунвальдскай бітвы камандаваў харугвамі, сустракаў прысутных. Па старадаўняй традыцыі пачэсных гасцей частавалі жыватворным напоем зямлі Мсціслаўскай — духмяным хлебным квасам.

— За доўгія гады на нашай зямлі аб'ядналіся традыцыі розных народаў і дасягненні шматлікіх пакаленняў. Фестываль для нашага горада — гэта не толькі захаванне традыцый даўніны, але і адраджэнне народнай культуры і побыту, — заўважыў **Аляксандр ПРАКОПАЎ, старшыня Мсціслаўскага райвыканкама.** — Гэта вяртанне ў эпоху Сярэднявечча і праслаўленне нашых продкаў, у крыві якіх жыла любоў да Айчыны, сваёй зямлі, народа як вечных каштоўнасцяў, што яднаюць пакаленні.

Пераможцу турніру князь паабяцаў падарыць куфэрак княжацкі, рукамі ўмельцаў зямлі Мсціслаўскай зроблены. Камандор ордэна паўночнага храма місір Гілмар Дэво перасёк канат як знак поўнай гатоўнасці да спаборніцтваў, а **біскупскі вікарый для Магілёва і Магілёўскай вобласці Аляксандр ЯШЭЎСКІ** блаславіў удзельнікаў турніру:

— Народ, які не памятае сваю гісторыю, — народ без будучыні. Рыцарскі фэст сведчыць, што наш народ не толькі памятае гісторыю продкаў, але і жадае нястомна яе паглыбляць. Калі мы чуем слова рыцар, то ўспамінаем тры словы. Бог — які заўжды павінен быць на першым месцы, тым больш, калі ён не блаславіць, то чалавек працуе дарэмна і дарэмна спажывае хлеб. Таму вельмі добра, што па традыцыі мы просім Божага блаславення напачатку гэтага рыцарскага спаборніцтва. Другое слова — гонар. Рыцары ганарыліся дасягненнямі, здзейсненымі на карысць народа і краіны, а не ўласнымі дасягненнямі. Трэцяе слова — Айчына, любоў да якой няхай не толькі ўзрастае ў нас, але і перадаецца нашым нашчадкам.

### ФАЛЬШЫЁНЫ, ТАПАРЫ, ЛУКІ

Пасля ўрачыстага адкрыцця свята над гарадской плошчай загучала сярэднявечная музыка гурта «Літы талер», а на Замкавай гары пачаліся конныя забавы. Рыцары з клуба «Залатая шпора» забаўлялі натоўп майстэрскай выездкай коней і на поўным скаку намагаліся насадзіць на дзіду хусцінку, якую прыгажуня з гледачоў кінула на зямлю. Яе гаспадыню пасля прамчаў на кані воін — пераможца гэтага спаборніцтва.

Пасля на рысталішча падцягнулася пяхота, воіны якой у схватках трое на трое рэканструявалі гістарычны сярэднявечны бой — змаганне на муляжах дакладней зброі: мячах, фальшыёнах, тапарах, алебардах.




— Воіны могуць выкарыстоўваць удары, прымяняць барцоўскую тэхніку, кідкі, падсечкі, рабіць удары любымі часткамі цела і зброі. Мэта рыцара — вывесці апанента з бою, а менавіта — калі вораг ляжыць на зямлі, — расказаў аб правілах бою **суддзя, які прадставіўся, як маршал Беларр.** — Забаронена любая работа ў ступні, пахвіне, вочы, пад калена, кідкі прагібам і заломы супраць натуральнага згібу сустава.



Ваявалі рыцары з такім імпэтам, што, каб не ўпасці на зямлю і не прайграць схватку, некалькі разоў бурылі агароджу, якая абараняла гледачоў ад бойкі.

Паралельна з двубоямі рыцараў непадалёк ад рысталішча праходзілі спаборніцтвы лучнікаў. У адборачным туры было сем застрэлаў з розных дыстанцый, у кожным з якіх выпускалася ад трох да шасці стрэл. Па іх выніках фарміравалі двойкі стральцоў, якія ў дуэлі стралялі па падаючых мішэнях — чарапах. У кожнага воіна — па тры стралы, каб можна было выбіць усе цэлі.

Адна з удзельніц спаборніцтва — пяцігадовая Марына Кражава, якая прыехала на турнір разам з бацькамі. Дзяўчо не першы раз на падобных мерапрыемствах, аднак як лучніца страляе ўпершыню. Кажа, што навучыў страляць бацька.

— Дуэлі — псіхалагічна самы складаны від застрэлаў, астатнія ўтрымліваюць больш гульнявых момантаў, — кажа яе бацька, **Аляксандр КРАЖАЎ, кіраўнік Мінскага стралковага клуба «Боў'с Клаб».** — Клуб стварыўся 12 гадоў назад. Мы арыентуемся на часы Залатой арды і Усход, праблема толькі, што знешнасць наша не азіяцкая. Марына летась на лучнікаў глядзела з пагардай, бегала выключна з мячом і захаплялася толькі ратнікамі. Лук узяла ў рукі літаральна месяц таму.

Бацькі Марыны жанатыя восем гадоў. Яны поўныя цёзкі: Аляксандр Сяргеевіч і Аляксандра Сяргееўна, пазнаёміліся на хвалі стральбы з лука. Яны і цяпер жывуць у майстэрні.

Аляксандр, дарэчы, стаў пераможцам турніру лучнікаў. Яго паплечнікі жартуюць, што нямалую ролю ў гэтым адыгрываў брэх сямейнага сабакі — аўстралійскага келі Вілі, які падтрымліваў гаспадара.

### ЗЕЛЛЕ ВЕДЗЬМЫ, МАНЦІЛЕТЫ, БІТВА ЗА ВАДУ

Госці фестывалю былі не толькі гледачамі, але і ўдзельнікамі некаторых мерапрыемстваў турніру.



Вывучалі сярэднявечныя танцы, удзельнічалі ў тэматычных квэстах, варажылі на курыных лапках і даведваліся пра будучыню ў руннага аракула.

Каб падсілкавацца, госці наведалі падворак «Старажытныя напоі — карысць для душы і цела». Тут можна было пачаставацца арыгінальнымі напоямі, напрыклад, 50-градусным «Зеллем ведзьмы», якое варылася са слёз дракона, воўчых ягад, павучыных лапак, крылаў кажана, валасоў ведзьмы. Моцны напой, сама каштавала. Гатавалі пачастунак «патомныя ведзьмы» Надзея і Галіна з сельскага дома культуры Мсціслаўскага раёна.

Самыя дапытлівыя даходзілі да пажарнай вежы вышынёй 36 метраў, дзе можна было пазнаваць у звон.

— Гістарычны Мсціслаў пераважна быў збудаваны з дрэва, таму пажары былі частай з'явай. У XIX стагоддзі згарэла больш за палову горада, і ў 1890 годзе стварылі добраахвотнае пажарнае таварыства, дзе неслі службу жыхары. У 1936-м для дазору збудавалі пажарную вежу, з якой можна было ўбачыць увесь Мсціслаў, — расказала **Юлія ХАРАЛЬЦОВА, галоўны захавальнік Мсціслаўскага гісторыка-археалагічнага музея.** — Унутры вежы прадстаўлены прадметы, якія могуць прывесці да пажару, і прыстасаванні, якія дапамагаюць з ім змагацца.

Відовішчнымі былі і рыцарскія бугурты. Паводле сцэнарыя, рыцары доўгі час хадзілі па пустыні і натрапілі на аазіс, ваду з якога трэба было заваяваць, разбурыўшы ахоўныя сцены, а вадачэрпіі кружкамі мусілі перанесці напой у свае гляркі. Былі таксама бітва на мосце, бітва за манцілетамі, змаганне за золата тампліераў, захоп сцяга...

Былі на фэсце і дзве гераіні дасярэднявечных часоў — мяжы X і XI стагоддзяў. Ірына і Вольга прадстаўлялі дзяўчат з племені дрыгавічоў і латгалаў — народнасці, што і дагэтуль жыве на мяжы Беларусі і Латвіі. Сяброўкі прыехалі з Мінска. Яны кажуць, што раней уваходзілі ў гістарычныя клубы, аднак цяпер дарослае жыццё не дазваляе траціць шмат часу на гэта. Тым не менш на фестываль сабраліся і рушылі без роздуму.

Коннае міле клуба «Залатая шпора» — папулярная забава сярэднявечча, якая выклікала шквал эмоцый. Рыцары на конях павінны былі выхапіць сцяг з рук сцяганосца, якога ахоўвалі воіны, таму на рысталішчы адбываліся жорсткія баі. Пасля гэтага сярэднявечных гледачоў забаўляў трукавым шоу клуб «Шатландская пяхота», воіны якога пасля паказалі на адным з добраахвотнікаў яшчэ і розныя варыянты пакарання смерцю праз катаванні.

Кульмінацыяй турніру стаў штурм мсціслаўскага замка— бой са стралянінай, стрэламі і падпалам. А самы каштоўны прыз турніра — княжацкі куфэрак — атрымалі рыцары клуба Kanton Zurich, у якім рэканструююць позняе сярэднявечча — баявую культуру Швейцарыі і Германіі XIV стагоддзя.

Скончылася свята выступленнем фольк-гурта «Стары Ольса» і гурта «Адамант» з Падмаскоўя. А таксама вогненным фэнтэзі-шоу Dragon і StreamShow і фаер-шоу тэатра агню «Маргратэя», пасля якіх усе, хто яшчэ мог, рушылі на сярэднявечную дыскатэку.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота аўтара і БелТА.**

---

Тым часам

### КАЛАРЫТНЫЯ СВЯТЫ ПРАЙШЛІ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

**Дзень кола ў Кальчунах у Ашмянскім раёне і фестываль «Мястэчка» ў Міры на Карэліччыне адбыліся на выхадных у Гродзенскай вобласці.**



Адмысловыя рысы нацыянальных культур беларусаў, палякаў, яўрэяў, татар і цыган перадалі арганізатары фестывалю праз падворкі, створаныя ў Міры. Каларыт кожнай народнасці падкрэслівалі таксама стравы, абрады і музыка кожнай нацыі. Госці свята частаваліся адмысловымі прысмакамі і ўдзельнічалі ў квэсце «Сцежкамі стагоддзя». Арганізатары мяркуюць, што праз такое свята ўдалося перадаць цеснае перапляценне культур розных народаў, якія цягам стагоддзяў мірна і плённа разам працавалі і адпачывалі на Мірскай зямлі.

А вось на Дні кола ў Кальчунах госці былі гэтаксама і ўдзельнікамі свята. Да мясцовага дома культуры прыязджалі на самакатах, веласіпедах, роліках, гіраскутарах, матацыклах і аўтамабілях. Не забыліся арганізатары запрасіць і прафесіянальных кіроўцаў: клуб аматараў BMW, байкераў з аб'яднання супольнасці NO LIMITS і членаў велаклуба ROVAR. Як сведчаць усе ўдзельнікі, было весела, ярка і вельмі гучна.



Знешні выгляд Уладзіміра ВІЛЬЧЫНСКАГА заўсёды адпавядае зместу калекцыі беларускай этнаграфіі.




# ПАРТРЭТЫ Ў ІНТЭР'ЕРЫ СПАДЧЫНЫ



Былы трактарыст і ляснік, а цяпер — вольны пчалавод Аляксандр ХРЫТАНОВІЧ.

Вёска Заазер'е, пра якую я хачу расказаць у гэтых фотаздымках, знаходзіцца побач з дарогай Сянно — Чашнікі. Тут жывуць толькі пяць чалавек, тым не менш яна жывая і па-свойму цікавая, найбольш вядомая з усіх чатырох сенненскіх Заазер'яў. Справа ў тым, што тут узнікла адна з першых у раёне аграсядзіб. «Спадчынай» запраўляе чалавек з залатымі рукамі — майстар разьбы па дрэве Уладзімір Вільчынскі. Фігуры жывёл, птушак, а найбольш тыпажы сялян, зробленыя разьбяром, густоўна аздабляюць падворак аграсядзібы, надаюць гасцявой атмасферы ўтульнасць і вясёлы настрой.

— Чаму такая назва ў аграсядзібы — «Спадчына»? — пытаецца Вільчынскі пры сустрэчы і тут жа адказвае. — Гэта не толькі побытавыя рэчы вяскоўцаў, якія я сабраў, як музейныя экспанаты, але і сама вёска — яе немудрагелістая архітэктура, ландшафтны асяродак, прырода — гэта таксама спадчына для нас, хто адсюль родам. Лепш за ўсіх сказаў наш пясняр Янка Купала ў сваім вершы «Спадчына» — быццам пра нашу вёску.

Уладзімір Вільчынскі як сапраўдны краязнавец ашчадна захоўвае кожную звестку пра вёску як важную і каштоўную рэч. Яго разумеюць іншыя жыхары, якія і выбралі яго старастам вёскі. Заазер'е мае толькі адну вуліцу — пасляваенная планіроўка (у вайну вёска была спалена немцамі). На адным канцы жывуць два пчаляры — Уладзімір Гушча і Аляксандр Хрытановіч. На другім — Галіна Арол. У цэнтры паселішча ў матулінай хаце халасцякуе Аляксандр Кажарскі. Але ў садавіна-гародніны сезон у Заазер'е ў бацькоўскія хаты вяртаюцца, нібыта птушкі з далёкага выраю, былыя жыхары, каб уволю адпачыць і набрацца сіл, надыхацца родным паветрам. Пры гэтым напрацавацца і вырасціць ураджай. І — чарговы раз пакінуць роднае гняздо. Галіна Палітыка і яе сын Рыгор з нявесткай Кацярынай кожнае лета «прапісваюцца» пад дахам дзедавай хаты.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

***Больш здымкаў глядзіце на сайце «Звязды».***



Галіна ПАЛІТЫКА ў інтэр'еры хаты свайго дзяцінства.



Уладзімір ГУШЧА пераехаў у Заазер'е, каб адводзіць душу на мядовай пасецы.



Аляксандр КАЖАРСКІ і яго сябар — лайка Цюк.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## *ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» проводит открытый аукцион по продаже имущества*

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»**

| | |
|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инв. № 500/D-7113080, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52-1. Площадь – 5132,2 кв. м. Наименование – Помещение многофункциональное. Назначение – Помещение многофункциональное. Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем.<br>Изолированное помещение входит в состав капитального строения с инв. № 500/C-30416, наименование А 3/к-кп Здание блока обслуживания, площадью – 6737,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000005000418, площадью 19,9465 га, предоставленного продавцу на праве долевого постоянного пользования. Срок действия: не установлен.<br>На земельном участке установлены следующие ограничения:<br>Санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 2,5940 га; Охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 1,6738 га |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **4 216 919,52** |
| **Задаток, BYN** | **421 691,95** |
| **Шаг аукциона** | 5 % |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 500/C-38607, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/2. Площадь – 1606 кв. м. Наименование – Производственно-складской корпус № 1. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а), площадка (Литер б, в, г), подпорная стенка (Литер д), бордюр 0,16 (Литер е), ограждение (Литер ж, и). Обременение: аренда.<br>Внутриплощадочный ж/дор. путь (Колядичи).<br>Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005933, площадью 0,6288 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования, срок действия: не установлен.<br>На земельном участке установлены следующие ограничения:<br>Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0136 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0100 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,1300 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,2070 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0310 га. |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN.** | **1 217 146,34** |
| **Задаток, BYN.** | **121 714,63** |
| **Шаг аукциона** | 5 % |

| | |
|---|---|
| **ЛОТ № 3** | Капитальное строение с инв. № 500/C-38608, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60. Площадь – 6672 кв. м. Наименование – Здание специализированное складов. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а), дорожка (Литер б, в), площадка (Литер г, д, е, ж, и, к), бордюр 0,08 (Литер л), бордюр 0,16 (Литер м), ограждение (Литер н, п), ворота (Литер р).<br>Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем.<br>Капитальное строение с инв.№ 500/C-38611, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/1. Площадь – 11,5 кв. м. Наименование – Контрольно-пропускной пункт. Назначение – Здание неустановленного назначения.<br>Гараж кирпичный (Колядичи); Внутриплощадочный ж/дор. путь (Колядичи); Электроподстанция 2КТП-400/1; Лифт грузовой, грузоподъемностью 3,2 тонны; Лифт грузовой, грузоподъемностью 3,2 тонны; Передаточные устройства (Колядичи); Передаточные устройства (Колядичи); Грязеотстойники и бензомаслоупок. (Колядичи).<br>Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005934, площадью 1,0714 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Срок действия: не установлен.<br>На земельном участке установлены следующие ограничения:<br>Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0272 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0506 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,1640 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,2864 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0400 га |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **5 042 777,68** |
| **Задаток, BYN** | **504 277,77** |
| **Шаг аукциона** | 5 % |

| | |
|---|---|
